№№13–14
(2741–2742)

31 студзеня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ЗВАРОТ

Аб абвяшчэнні 2008 года, года 90-га юбілею Беларускай Народнай Рэспублікі, Годам беларускай дзяржаўнасці



25 сакавіка 1918 года была абвешчана незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Тым самым пачаўся новы перыяд беларускай дзяржаўнасці. Стварэнне БНР стала лагічным завяршэннем этапу нацыянальнага адраджэння беларусаў XIX — пачатку XX стагоддзя, працягам тысячагадовага дзяржаватворнага працэсу ў Беларусі.

На жаль, БНР праіснавала нядоўга, бо не змагла супрацьстаяць імперыялістычнай і бальшавіцкай экспансіі.

Чаму вучыць гістарычны вопыт БНР?

Па-першае. БНР — праз заснаваныя ёю дзяржаўныя інстытуты, атрыбуты ўлады і асобы сваіх кіраўнікоў — увабрала ў сябе гістарычны вопыт беларускай дзяржаўнасці.

Карані беларускай нацыі і дзяржавы сягаюць у VI—IX стагоддзі да першых дзяржаўных утварэнняў крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў і літвы. Зорнымі вышынямі айчыннай дзяржаўнасці сталіся Полацкае, Смаленскае, Тураўскае і іншыя княствы, Вялікае Княства Літоўскае, паўстанніцкія беларускія дзяржавы 1794 г., 1830—1831 гг., 1863—1864 гг., 1920 г.

Па-другое. БНР уяўляла сабой мадэль вольнай, суверэннай і дэмакратычнай рэспублікі.

Па-трэцяе. БНР цвёрда і дакладна акрэсліла для міжнароднага супольніцтва права беларусаў заняць "свой пачэсны пасад між народамі" як самастойны і самадастатковы міжнародны суб'ект.

Па-чацвёртае. БНР — праз свае першыя вайсковыя фарміраванні — Менскі і Гарадзенскі палкі, збройныя атрады Слуцкай брыгады ў часе Слуцкага збройнага чыну — паказала ўсяму свету, што памяркоўны беларускі народ у ліхі час здольны бараніць зямлю продкаў.

Па-пятае. Факт стварэння і жыццядзейнасці БНР аказаў настолькі моцны ўплыў на ўсю палітычную сітуацыю, што з ім вымушана была лічыцца і савецкая ўлада. Гэта знайшло сваё ўвасабленне ў стварэнні БССР, што праз сем дзесяцігоддзяў адкрыла мажлівасці для абвяшчэння сучаснай незалежнай і суверэннай Рэспублікі Беларусь.

І, урэшце, ад пачатку XX стагоддзя да сённяшняга часу БНР — сімвал нястомнай барацьбы беларускага народа за свабоду і нацыянальнае адраджэнне, захаванне роднай мовы, культуры, гістарычнай сімволікі, за ўмацаванне нацыянальнай свядомасці.

Вось чаму створаны 19 ліпеня 2007 г. з ініцыятывы Міжнароднага грамадскага аб'яднання "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" Агульнанацыянальны грамадскі арганізацыйны камітэт па святкаванні 90-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі звяртаецца да беларускага грамадства, органаў улады краіны з прапановай абвясціць 2008 год Годам беларускай дзяржаўнасці, а 25 сакавіка — дзяржаўным святам.

Падрыхтоўка да юбілею і яго святкаванне павінны стаць падмуркам яднання розных рухаў, партый, згуртаванняў, арганізацый, усіх грамадзян незалежна ад палітычнай арыентацыі на грунце прызнання прыярытэтамі дзяржаўнага будаўніцтва нацыятворных пытанняў мовы, гістарычна сцверджанай сімволікі, свабоды і дэмакратыі.

У склад Аргкамітэта ўвайшлі вядомыя грамадскія дзеячы з Беларусі і замежжа, прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, рухаў, партый і арганізацый, беларускіх суполак з розных краін свету. Ганаровая старшыня Аргкамітэта — Старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла, сустаршыні — Генадзь Бураўкін, Радзім Гарэцкі, Аляксей Марачкін. Рабочай групай Аргкамітэта распрацаваны каляндарны План-графік юбілейных мерапрыемстваў.

Мы заклікаем усіх грамадзян Рэспублікі Беларусь узяць непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы і святкаванні 90-х угодкаў БНР. Кожная беларуская сям'я — гэта цаглінка ў гмах беларускай дзяржаўнасці, гэта паўнапраўны чыннік і творца яе сучаснай гісторыі.

Пісьменнік і настаўнік, рабочы і селянін, дзяржаўны службовец і бібліятэкар, праграміст і фермер, сябра партыі і грамадскі актывіст, вернік і атэіст — усе, хто ўсведамляе сябе беларусам і грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, мусім стаць поруч. Ад нас, ад нашай пазіцыі залежыць наша з вамі будучыня, будучыня нашых дзяцей і ўнукаў — нашчадкаў Беларускай Народнай Рэспублікі.

Агульнанацыянальны аргкамітэт па святкаванні 90-х угодкаў БНР

Нагадаем,што каардынуе працу аргкамітэта МГА "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына".

«Лукашенко, видимо, думает, что весь мир ошибается»

Новый глава Парламентской ассамблеи Совета Европы (ПАСЕ), испанский сенатор **Луис Мария де Пуч** в интервью "Коммерсанту" рассказал, что он думает о ситуации в Беларуси.

— Единственная страна в Европе, у которой нет отношений с Советом Европы, — Беларусь. Вам не кажется, что изоляция Александра Лукашенко вовсе не помогает? Как вы планируете выстраивать отношения с Беларусью?

— Изоляция очень мешает. И нам, и его стране. Но пока именно Лукашенко не хочет иметь с нами ничего общего. Мы предлагаем ему вести себя так же, как все. Но он отказывается брать на себя те обязательства, которые уже взяли все страны Европы. Лукашенко, видимо, думает, что весь мир ошибается, а он прав. Однако Лукашенко в любой момент может обратиться к Совету Европы и взять обязательства. Мы постараемся сделать все, чтобы как-то наладить контакты, чтобы открыть двери, чтобы интеграция Беларуси в Европу была возможна.

У Еўропу!

Вядомыя палітыкі **Мікола Статкевіч, Міхаіл Марыніч, Віктар Івашкевіч** і **Андрэй Саннікаў** абвясцілі аб пачатку новай доўгатэрміновай палітычнай кампаніі "Еўрапейская Беларусь". Таксама былі агалошаны асноўныя даты правядзення апазіцыйных веснавых вулічных акцый — гэта 25 сакавіка і 1 мая.

25 сакавіка — Дзень волі і 90-годдзя стварэння БНР, акцыя для дэмакратычнага асяродку традыцыйная. Што ж тычыцца Першамая, то Мікола Статкевіч патлумачыў: *"1 мая — адна з гадавін стварэння Еўрапейскага Саюза і адначасова дзяржаўнае свята Беларусі. Мы вырашылі выкарыстаць гэтыя абставіны. Хачу сказаць, што 25 сакавіка — гэта таксама дата на шляху Беларусі да Еўропы, вяртання ў Еўропу."*

Доўгатэрміновая кампанія "Еўрапейская Беларусь" ставіць сваёй мэтай уваходжанне Беларусі ў Еўрасаюз. У рамках кампаніі мяркуецца сабраць сотні тысяч подпісаў пад гэтай ініцыятывай. *"Сабраныя подпісы павінны будуць засведчыць, што беларускі народ, беларускае грамадства хочуць быць у сям'і вольных еўрапейскіх краін",* — гавораць ініцыятары кампаніі.

Алег СНОЎ.

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Кончай базар!

Приснилось мне в страшном сне, будто нет у нас государства. Страна есть, мы есть, столица на месте, а государство куда-то исчезло. Народ свободно по улицам шатается, прямо по проезжей части, разными флагами размахивает, шуточки нехорошие отпускает. Безобразничает, словом...

Проснувшись, однако, успокоился. ОМОН, как всегда, на страже; в телевизоре, чтобы в холодный пот не бросало, привычно объясняют, почему ОМОН всегда прав; и, наконец, глава государства по-прежнему гоняет больших и маленьких чиновников в хвост и гриву...

В общем, хотя сон не в руку, а заставил задуматься над некоторыми парадоксами нашего бытия. Вот самый животрепещущий из тех, что наяву: забастовка предпринимателей. Ну где, в каком еще государстве предприниматели... бастуют? Из каких краев явилась к нам такая, извините, белиберда? Польские таможенники — понятно, французские транспортники — без вопросов, даже полиция... Но чтобы предприниматели!

Или вот еще парадокс: за наши же, налогоплательщиков, деньги нас же тащат в каталажку. Добро бы каких-нибудь хулиганов, которые витрины бьют, фонари ломают и жгут машины... Так нет же, вполне мирных людей, отчаявшихся, правда, докричаться до доморощенного истеблишмента.

Ну а самые острые парадоксы можно найти в нашей выстраданной и время от времени еще вынужденной страдать Конституции. Не буду утомлять цитированием ее 13-й и 14-й статей. Воскликну лишь: какая музыка, какие аккорды! Равные права... равная защита... равные условия... равные возможности... принципы равенства... уважение прав и интересов!..

И все это про бизнес, про наших шумных "ипэшников" в том числе... Да если б торжествовали "равные условия", у нас, в духе известного указа, весь бизнес, вся экономика стала бы семейной. А что, совсем неплохо: что ИП, что ЧУП, РУП или, не дай Бог, ТРУП — сплошь родственники, одна большая семья...

Впрочем, хватит зубоскалить. Тем более что обо всем этом уже написаны и наговорены горы. Но человеку, равноудаленному, так сказать, от интересов сторон, разобраться, кто из них прав, очень трудно. Послушаешь г-на Тура, заместителя министра нашей процветающей экономики, — двумя руками "за". Ну, кто ж будет против того, чтобы ипэшник Иванов, развиваясь по предложенной г-ном Туром схеме (юрлицо—корпорация—холдинг—синдикат), становился белорусским Рокфеллером или Романом Абрамовичем, на худой конец?! Но сам ипэшник Иванов этого почему-то не хочет. Не утруждая себя ответом на естественный вопрос "почему?", г-н Тур констатирует: "Он не стремится развиваться". И потому, продолжает, "он не очень выгоден государству..."

Проговорился, однако, замминистра, раскрыл один ма-а-аленький секрет, который отличает наше государство от тех, где рождаются Рокфеллеры и Абрамовичи, а предприниматели, даже самые-самые мелкие, которым несть числа, не бастуют и едва ли когда вздумают бастовать. Потому что в тех государствах, даже в России, разницы в правовых, в том числе налоговых, отношениях между крупным, средним или мелким бизнесом нет. А у нас — есть. Потому что государство наше до сих пор мнит себя единственным работодателем, каким было в советские времена, проявляя заинтересованность не столько в законопослушании бизнеса (да только ли его?), сколько в прямом послушании. Во всяком случае, таковой остается психология тех, кто за нас, за свободный рынок и непослушного ипэшника Иванова решает, выгоден он или нет. Выгоден — работай, не выгоден — пошел в ЧУП. Мы тебе даже песочек подсыплем, чтоб не поскользнулся, соломки подстелем, чтоб не сразу ушибся... "Я ипэшникам не сочувствую, — говорит одна бизнес-леди, пока не потерявшая юрлица, — они не платят сумасшедшего налога с продаж..." Вот так — не "сумасшедший" налог сделать разумным для всех, а ипэшника — "сумасшедшим"...

Что ж, можно поздравить "победителей", если даже собратья по бизнесу понимать ипэшников и поддерживать их не хотят. Только вот цивилизованным рынком, о котором так любят рассуждать глашатаи "белорусской модели", вся эта эпохальная затея, начиная с "блох" и кончая "семейным" указом, не пахнет.

Пахнет разборками и примитивным базаром.

kamerton_41@mail.ru

ГУЧНАЯ СПРАВА

Ігар Адзярыха і Юрый Астроўскі выкліканы ў суд

У маскоўскім судзе Мінска працягваюцца слуханні па справе кардыяхірурга РНПЦ "Кардыялогія", загадчыка 2-га кардыяхірургічнага аддзялення Аляксандра Шкета. У якасці сведкаў у суд запрошаны дырэктар цэнтра Ігар Адзярыха і кардіяхірург нумар адзін у Беларусі Юрый Астроўскі.

Судовыя слуханні па гучнай справе кардыяхірурга Аляксандра Шкета распачаліся 4 студзеня. Пасяджэнні праходзяць амаль кожны дзень. У суд часцей за ўсё кардыяхірург прыязджае пасля аперацый. Здараецца, што слуханні доўжацца амаль цэлы дзень — з раніцы і да вечара.

Ужо апытана большая частка сведкаў з боку абвінавачвання. Што прыкметна, амаль палова былых пацыентаў у суд не прыходзяць. Па якой прычыне — не вядома. Магчыма, яны перадумалі даваць паказанні супраць урача, які ў свой час выратаваў ім альбо іх родным жыццё. Магчыма, выяўляецца той факт, што большасць сведкаў іншагароднія.

Здараецца, што падчас судовых пасяджэнняў высвятляюцца дзіўныя рэчы. Напрыклад, адзін са сведкаў са здзіўленнем даведаўся, што следчыя прыпісалі яму паказанні, якіх ён насамрэч не даваў. Падчас следства ён прызнаваўся, што даваў хвораму бацьку грошы, якія той у сваю чаргу перадаваў медыцынскай фірме на закупку расходнага матэрыялу. А следчыя нібыта са слоў мужчыны запісалі, што грошы былі перададзены асабіста кардыяхірургу Аляксандру Шкету.

Многія сведкі дзякуюць Аляксандру Шкету за ягоную працу. Але прызнаюцца, што ўсё роўна хочуць вярнуць грошы, якія ў свой час расходавалі на аперацыю. На якой падставе і хто іх павінен вярнуць — урач, клініка альбо медыцынскі цэнтр, — былыя пацыенты ці іх родныя дакладна не ведаюць, але спасылаюцца на тое, што падчас следства ім абяцалі гэта зрабіць.

Гэтымі днямі ў суд у якасці сведкаў запрошаны супрацоўнікі РНПЦ "Кардыялогія". У лютым суд выслухае паказанні і кіраўнікоў цэнтра. Позвы ў суд дасланы дырэктару РНПЦ Ігару Адзярыху і былому кіраўніку клінікі Мікалаю Манаку (усе эпізоды гучнай справы тычацца перыяду з 2001-га па 2003 год, калі менавіта М.А.Манак узначальваў медыцынскую ўстанову). Таксама сведчыць у судзе запрошаны вядомы кардыяхірург Юрый Астроўскі. У 2001—2003 гадах ён займаў пасаду намесніка дырэктара РНПЦ "Кардыялогія", асуджаны кардыяхірург працаваў пад непасрэдным кіраўніцтвам Юрыя Астроўскага.

Нагадаем, што Аляксандра Шкета абвінавачваюць у махлярстве, злоўжыванні службовым становішчам, неаказанні медыцынскай дапамогі, атрыманні хабару за станоўчае рашэнне пытання аб правядзенні аперацыі на сэрцы. Разам са Шкетам па гэтай справе праходзіў кардыяхірург РНПЦ "Кардыялогія" Сяргей Балашка. Але ў маі 2007 года 33-гадовы Сяргей Балашка скончыў жыццё самагубствам. Не дажыў да судовага пасяджэння яшчэ адзін абвінавачаны — былы дырэктар УП "Баст" Барыс Вайтман. Па словах родных, у прадпрымальніка не вытрымала сэрца, калі ён даведаўся, што супраць яго ўзбуджана крымінальная справа.

Другому прадстаўніку камерцыйных структур — намесніку дырэктара СП "Мультымедыцын" Ігару Васюкевічу — інкрымінуюць махлярства, злоўжыванне службовым становішчам і незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

Аляксандр Шкет сваёй віны не прызнае. Ігар Васюкевіч пагаджаецца толькі з тым, што займаўся незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ПАЛІТКУХНЯ

Дэмакраты падалі ў суд на палатнікаў

Група брэсцкіх актывістаў Аб'яднаных дэмакратычных сіл падала скаргі ў раённыя пракуратуры на бяздзеянне дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Алега ВЯЛІЧКІ і Валянціны КАЧАН.

У скаргах яны паведамілі, што не атрымалі адказаў ад гэтых дэпутатаў на свае звароты да іх ад 10 снежня мінулага года аб правядзенні сустрэчы. Аўтары скаргаў спасылаюцца на закон "Аб зваротах грамадзян", прэзідэнцкую дырэктыву аб дэбюракратызацыі дзяржапарату і Указ "Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб".

Актывісты Горацкай рэгіянальнай кааліцыі дэмакратычных сіл таксама сабралі больш за 400 подпісаў выбаршчыкаў са зваротам да дэпутата Палаты прадстаўнікоў **Таццяны АСМАЛОЎСКАЙ** з прапановай правесці ў Горках сустрэчу і даць справаздачу аб яе дзейнасці.

Мяркуецца, што падчас сустрэчы павінны быць абмеркаваны пытанні пра адмену льгот, магчымае будаўніцтва АЭС, а таксама шмат іншага. Згодна з заканадаўствам, дэпутат парламента павінен зрабіць справаздачу аб сваёй дзейнасці, калі да яго звернецца з такой прапановай не менш за 300 выбаршчыкаў.

А вось 100 выбаршчыкаў Гомеля падалі іск у суд на прэзідыум мясцовага гарсавета, які адмовіў у правядзенні сходу выбаршчыкаў. Як паведаміў БелаПАН старшыня Гомельскай абласной арганізацыі АГП Васіль Палякоў, на сустрэчы планавалася ўзняць пытанне аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў **Ларысы КУЗНЯЦОВАЙ**, якая балатавалася па Савецкай выбарчай акрузе №36 г.Гомеля.

У сваёй перадвыбарнай праграме дэпутат абяцала "дамагацца гарантаванай сацыяльнай абароны розных катэгорый грамадзян". Выбаршчыкі палічылі, што, прагаласаваўшы за прыняцце закона аб упарадкаванні льгот, які значна пагоршыў сацыяльную абарону грамадзян, спадарыня Кузняцова парушыла свае перадвыбарныя абяцанні і не апраўдала даверу насельніцтва.

"Мы звярнуліся ў гарсавет на пачатку студзеня і атрымалі адмоўны адказ, з якім не згодныя, — паведаміў **Васіль ПАЛЯКОЎ**. — *Як і са сцвярджэннем, што ў заяве 168 выбаршчыкаў няма падстаў для адклікання дэпутата. Яна не выканала не толькі свае перадвыбарныя абяцанні, Канстытуцыю, але і закон аб звароце грамадзян, паколькі праігнаравала зварот да яе 300 выбаршчыкаў".*

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ДАТА

Міхаіл ПТАШУК:

«Мне лёгка, калі цяжка»

28 студзеня народнаму артысту Рэспублікі Беларусь, вядомаму рэжысёру Міхаілу Пташуку споўнілася б 65 гадоў.

"З дзяцінства ў мяне засталіся ўспаміны пра шырокую лаву і канат, якім мяне білі за тое, што я хаваўся ў кінаклубе і спрабаваў заначаваць там. Я вельмі любіў кіно", — так пра сябе самога расказваў Міхаіл Пташук.

У кінатэатр "Цэнтральны", дзе адбыўся вечар памяці славутага рыжысёра, прыйшлі яго родныя, сябры і калегі, каб падзяліцца ўспамінамі пра Пташука.

Сцэнарыст Алена Папова ўзгадвае: *"Я ведала Міхаіла яшчэ са студэнцкіх гадоў. Аднойчы мы сустрэліся, Міша быў вельмі сумны і ўсё глядзеў на сваю руку. Я запыталася: "Што здарылася?" А ён так сумна адказаў: "Мне сёння сказалі, што ў мяне вельмі кароткая лінія жыцця... І сапраўды, Міша пражыў мала, але пакінуў пасля сябе значны след, вялікую кінематаграфічную спадчыну".*

Міхаіл Пташук прыйшоў на кінастудыю "Беларусьфільм" у 1974 годзе і ўсю сваю творчую біяграфію прысвяціў беларускаму кінематографу. На нацыянальнай студыі Пташук зняў такія знакамітыя стужкі, як "Час выбраў нас", "Вазьму твой боль", "Чорны замак Альшанскі", "Знак бяды" і іншыя.

"Аб тым, што буду рэжысёрам, зразумела, я і думаць не мог. А ўжо праз гады зразумеў, што без гэтай прафесіі не змог бы. Маё любімае слова — "Матор". За ім так многа стаіць — нервы, слёзы, лёсы акцёраў... Таму, калі я вымаўляю гэтае слова, адчуваю вялікую адказнасць. Шчыра кажучы, мне лёгка, калі цяжка", — гаварыў пры жыцці Міхаіл Пташук.

На сустрэчы з прыхільнікамі таленту Міхаіла Пташука прысутнічала ягоная жонка Лілія Міхайлаўна. Яна, у прыватнасці, адзначыла: *"Пасля трагедыі наша сям'я адчула каласальную падтрымку, якая існуе і па сённяшні дзень. Тэлефануюць простыя людзі, прыхільнікі Мішы, і пытаюцца, чым трэба дапамагчы. І ведаеце, я ўпэўнена, што наш народ перамагчы немагчыма. Бо народ моцны не колькасцю зброі, а сілай свайго таленту і дабрадушша".*

Міхаіл Пташук загінуў у 2002 годзе ў аўтакатастрофе ў Маскве напярэдадні цырымоніі ўручэння расійскай прэміі "Ніка", дзе яго фільм "У жніўні 44-га" быў прадстаўлены ў шасці намінацыях. У трох з іх ён узяў прызы, але рэжысёр да гэтага ўжо не дажыў.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
31 СТУДЗЕНЯ 2008 г.

Ніл ГІЛЕВІЧ

Абрыўкі

Зварот

Пакладзіце, братцы людзі.
вы руку сабе на грудзі,
пакладзіце! —
і сабе ж, насупраць ночы,
у душу, як Богу ў вочы,
паглядзіце!

І скажыце-адкажыце
на адзінае пытанне
адназначна:
бачна вам дарога ў жыце,
на якой — выратаванне,
ці не бачна?

Як не бачна — Божа правы
назаве вам прыклад чыну —
дзейсны, годны,
як ад ганьбы і няславы
бараніць сваю айчыну,
край свой родны.

Калі зноскі ў сытым блудзе
і апошні трацяць сорам,
злыдні-зноскі, —
Каліноўскі хай вам будзе
чэсці й гонару узорам!
Каліноўскі!

2008 г.

Сувязь

Ён даўно ўжо за далягладам —
час дзяцінства і маладосці,
калі я атруціўся ядам,
праніклым і ў кроў, і ў косці.

Той бязрэчыўны яд
ёсць сумесь
гадства, подласці,
страху смерці...
Адчуваю жывую сувязь
ядавітых эпох у сэрцы.

2008 г.

Але

Маладым музыкам

Вы спрабуеце сцвердзіць сябе
у якойсьці вар'яцкай гудзьбе.
Гэты сквіл, гэты віск,
гэты скрогат
не прымаю зусім. Не цярплю.
І — нічога з сабой не зраблю.
Толькі суд мой
не бэсціце строга:
ёсць АЛЕ. Я — свабоду люблю.
У тым ліку — і вашу у спробах.

2008 г.

Дзякуй, брат!

Хто там "рэкнуў"
(мабыць, з нецвярозу),
што зачахла ніва Мастака?
Пачытайце ў "Дзеяслове" прозу
майстра-мага Віктара Казька.

Я — чытаў,
і, не стрываўшы болю,
сэрца растрымцелася да слёз.
Дзякуй, брат!
Так цяжка, як з табою,
я даўно ўжо
не ўспрымаў наш лёс.

2008 г.

Прыватнае

Калі ўжо сіл не стала ні шыша,
і нават "шыш"
закажанеў без веры —
Мне падарыла Добрая Душа
таўшчэзны пачак
фінскае паперы.
З наказам — як салдату
чарнабрыўка.
Маўляў: пішы!
А хоць бы і ў абрыўках.

2008 г., студзень

Да расправы над нстытутам літаратуры ў НАНБ

(Каментар з формулай)

Чым спрычынена расправа?
З-за чаго мітрэнга?
"Абязгрошыла дзяржава!
Эканоміць трэба!"

Ну, вядома! Ну, канешне!
Хоць банкуем вёртка —
Дзе ж тых грошай набярэшся?
Вось і стала пёрдка!

Грошы збеглі на будоўлю
лядовых палацаў.
А астатак — на гадоўлю
блазнаў і паяцаў.

Нават у Джымбабвабуры —
голым і галодным —
Інстытут літаратуры
лічыцца галоўным.

Дык яно і зразумела:
знаюць папуасы,
што без Слова маса цела
роўна целу масы.

Гэту формулу скумекаць
мы йшчэ не гатовы.
Лепей будзем бэкаць-мэкаць
без душы і мовы.

2008 г.

СОРАМ!

Члены БРСМ могуць піць гарэлку са скідкай

Як кажуць гісторыкі, усё новае — гэта добра забытае старое. Гэта аксіёма знайшла сваё пацвярджэнне ў вёсцы Вялікая Машчаніца Бялыніцкага раёна. Некалькі дзён таму на дзвярах кафэ "Мара", якое з'яўляецца даволі папулярным сярод моладзі навакольных вёсак і гарадскога пасёлка Бялынічы, з'явілася аб'ява, што па прад'яўленні членскага білета БРСМ наведвальніку кафэ робіцца скідка ў 5% за набытыя тавары і прадастаўленыя паслугі.

Як кажуць працаўнікі кафэ, найбольш папулярнымі заказамі сярод наведвальнікаў кафэ з'яўляюцца спіртныя напоі і піва. Можна толькі парадавацца за маладых будаўнікоў "рынкавага сацыялізму", зараз напіцца яны маюць магчымасць нашмат танней, чым ветэраны працы альбо прадстаўнікі незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт".

Ну а калі сур'ёзна, то мяне асабіста ахоплівае жаль, што дарослыя дзядзькі і цёткі, нашы раённыя ідэолагі, якія вядуць гэтую дурную гульню з моладдзю, не чыталі класічную савецкую літаратуру. Інакш яны б ведалі, што "піво только для членов профсоюза" даўно ўжо было ў нашай гісторыі...

Барыс ВЫРВІЧ.

Бялынічы.

О цинизме Евгения Новикова и тех, кто выпускает его на телеэкран

Скажу сразу, что телепередачи Евгения Новикова "Права человека. Взгляд в мир" я смотрю нерегулярно. В основном тогда, когда вообще ничего интересного нет на других каналах. И его передачу 13 января я посмотрел не полностью, лишь последнюю часть.

В ней речь шла о Беназир Бхутто, которая была убита экстремистами. Но Е.Новиков подал дело так, что ее убили западные спецслужбы. Заметьте, не имея на такой вывод никаких доказательств. Предложение английских спецслужб помочь в расследовании автор передачи подал телезрителям как попытку скрыть следы. Сказал: кто убивает, тот и следы прячет. И как параллель привел пример с пропавшими (убитыми) политиками в Беларуси. Е.Новиков сказал, что их убили западные спецслужбы. Что мертвые им важнее живых. Не буду говорить о том, каким циником нужно быть, чтобы вот так нагло ставить все с ног на голову. Как будто люди не знают о рапорте генерала Лопатика, о постановлении КГБ и прокуратуры о превентивном задержании Павличенко.

Но оставим это на совести Е.Новикова, обратим внимание на такой его пассаж. По его словам получается, что западные спецслужбы свободно перемещаются по нашей территории, убивают людей, а наши милиция и КГБ спят и ничего не замечают. Таким образом (по Новикову) получается, что милиция этим самым западным спецслужбам помогает. Товарищ Новиков! Перестаньте наводить тень на плетень. Искать убийц надо в другом месте. Вы можете представить себе, что о вас думают люди, что о вас думают жены, дети и матери исчезнувших? Но призывать вас к совести, стыду, чести бесполезно. Удивляет другое. Что вас пускают на телеканалы с такими пустыми, с такими циничными передачами. Хотя решение пускать вас на телепередачи, наверное, принимают не телеканалы. Кто -- можно догадаться. Скорее всего те, кто и отдал приказы об устранении Захаренко, Гончара, Красовского, Завадского и других.

Л.Т.МАКАРОВ,
житель г.Витебска.

ВОЗВРАЩАЯСЬ К ТЕМЕ

Повернись, государство, лицом к солдату

Я рад, что, несмотря на все трудности, газета "Народная воля" по-прежнему остается любимой и читаемой белорусами. Не успела моя статья выйти в свет, как услышал много откликов от незнакомых мне участников войны в Афганистане, а также солдат, которые воевали во Вьетнаме, Анголе, Венгрии, Никарагуа, Кореи и во многих других горячих точках земли. Меня благодарили за откровенность и правдивое отражение действительности.

Те, кто сегодня заседает в Палате представителей, думали, что за двадцать лет наши рубцы зажили, затянулись, но они ошиблись. Такие раны не заживают, пока бьется сердце человека. Солдатская память не смогла забыть ту драматическую войну. Да и разве можно такое забыть? Писатель Анатолий Приставкин сказал про солдат Великой Отечественной: *"У меня так время делится: до войны, война и все остальное..."* Я думаю, что его слова касаются любой войны, поскольку у войны одно лицо. Эмоции, переживания, тревоги, которые были у солдат Великой Отечественной, и те, которые испытывали солдаты афганской войны перед боем и во время боя, одни и те же — **а жить так хочется**...

Если кто-то думает, что война в Афганистане коснулась только самих участников войны, то скажу — это общая боль белорусского народа. И закрывать афганскую тему еще рано — о ней практически ничего не известно. Ведь многие наши соотечественники не знали, как в Афганистане трудно было служить солдатам, призванным проходить срочную службу в погранвойсках. Я был сначала пограничником, а потом пришла разнарядка отправлять по несколько человек с застав в Афганистан. Нам категорически запрещалось писать родственникам, что мы теперь не пограничники. Нельзя было фотографироваться, нельзя было даже делать "дембельские" альбомы... Вот так матери два года думали, что их дети служат на границе.

Пограничники очень хорошо воевали в высокогорных районах Афганистана, и прежде всего выполняли функции по пресечению караванов с оружием из Пакистана. Было проведено немало грамотных операций без потерь личного состава, но власть старалась не "светить" нас перед общественностью, и очень редко пограничников представляли к боевым наградам. Мне бы очень хотелось узнать, сколько все-таки пограничников было в Афганистане.

Самое непонятное для меня, что среди депутатов той же Палаты представителей есть наши офицеры-"афганцы", но они почему-то открыто не подняли этот вопрос в парламенте и на страницах газет. Считаю, что они, офицеры, предали всех "афганцев". Я хочу задать вопрос каждому: что вы скажете простому рядовому солдату, у которого нет такой пенсии, как у вас? Как им дальше жить? Это можно сравнить с тем, что вы бросили умирать солдат в бою.

Каждый из нас помнит: где бы он ни служил, всегда убитых и раненых солдат забирали с поля боя, чего бы это ни стоило. Мне рассказывали "дембеля", когда я прилетел на "точку" в Афганистан, как два дня вертолетчики с группой разведки пытались забрать тела двух убитых солдат. Было тяжело, но они это сделали, хоть после той операции было несколько раненых.

Скоро 15 февраля — День вывода войск из Афганистана. И вот снова придут чиновники, депутаты, люди из Администрации президента на Остров слез, что в центре столицы, и опять будут рассказывать, как много они делают для реабилитации воинов-интернационалистов.

Может, кто-то, прочитав мою статью, скажет: вас лишили льгот, но что же вы, здоровые мужики, подняли шум, чтобы снова отвоевать какие-то мизерные подачки? Я любому отвечу, что мы не за льготы бьемся, а за уважение к нам и за память о тех, кто погиб на войне и после войны. И как юрист скажу, что поправки в закон очень больно задели всех живых ветеранов войны, их сердца и честь, поскольку эти изменения незаконные. А поэтому надо писать, открыто говорить об этом, чтобы человечество знало главную черту войны — она никогда не заканчивается, поскольку победителей и побежденных в ней нет. Самое страшное начинается после войны, поскольку последствия тех переживаний так просто из души не уходят. А может, с годами еще больше обостряются.

Недавно позвонил мне мой сосед - "афганец" Олег Северинко, сказал, что срочно нужно делать операцию на бедре. Государство предоставляет протез, но врачи говорят, что его гарантия до пяти лет. Ему посоветовали найти спонсоров и купить протез голландского производства, у которого срок гарантии 25 лет. К сожалению, у больницы нет фондов для закупки дорогостоящих протезов. Стоимость — 4000 долларов США. Я говорю: срочно иди и пиши письма чиновникам, ведь есть закон о ветеранах, пускай ищут возможности и средства. Но он мне ответил: "Ну что мне им доказывать, просить, неужели им недостаточно того, что я протез заслужил своими ранениями?" Вот так отвечают многие орденоносцы, когда надо отстоять свои права. И я подумал: неужели так сложно государству найти эту сумму денег?

Посмотрите, сколько строится хоккейных стадионов, сколько выкладывается где надо и где не надо тротуарной плитки... Такие большие суммы денег уходят из бюджета, а моему другу не хватает всего 4000 долларов США для того, чтобы 25 лет его не беспокоила нога! Может, государству надо в первую очередь думать о людях, а уж потом о тротуарной плитке? Тротуарная плитка хороша только тогда, когда государство может дать качественный протез инвалиду войны. И лишь тогда можно такое государство назвать социально справедливым.

А что теперь делать воину-интернационалисту после поправок в закон? Именно поэтому я и утверждаю, что государство должно чувствовать свою ответственность за судьбы тех граждан, которые когда-то были вынуждены выполнять не совсем ясные и понятные задачи правительства страны. А с другой стороны, если государство не изменит свое отношение к участникам войны, то это также скажется на офицерском составе действующей армии, ведь теперь многие понимают, что пока ты здоровый — ты нужен стране, а как только у тебя начинаются проблемы со здоровьем — уже никому не нужен. И примером служит история с воинами-афганцами и ветеранами других локальных войн.

Я считаю, что точка в нашем вопросе еще не поставлена. Многие ветераны войны в Афганистане пока еще не осознали суть данной реформы по исключению нас из государственной социальной программы поддержки для ветеранов локальных войн. Еще многие стоят на льготной очереди по улучшению жилищных условий. А что делать тем, кто постоянно нуждается в бесплатных лекарствах?

Нет, господа депутаты, последнее слово будет не за вами, а за нами. Если мы, "афганцы", не будем бороться за свои права, то, смотришь, и наш Остров слез перенесут куда-нибудь подальше из центра. Земля тут дорогая. А потом, глядишь, чиновники вовсе постараются вычеркнуть из истории войну в Афганистане...

С этой целью группа "афганцев" готовит письма в Министерство обороны Республики Беларусь и Конституционный суд об ущемлении прав воинов-интернационалистов на пользование социальными льготами, установленными правительством СССР, которые были признаны бессрочными.

На мой взгляд, правительство, чтобы снять напряжение среди афганцев, должно сделать следующее: государство обязано восстановить нас в правах. А учитывая, что ветераны войны в Афганистане умирают тысячами, то необходимо уравнять нас с ветеранами Великой Отечественной войны. Принять комплексную государственную программу по реабилитации воинов-интернационалистов. Можно, например, как в США, где у участников войны во Вьетнаме есть свой госпиталь, открыть и в Минске специализированный госпиталь с новым оборудованием для участников войны, принимавших участие в боевых действиях не только в Афганистане, но и в других горячих точках. И чтобы госпиталь обладал таким бюджетом, где на любой протез всегда хватало бы денег. И это будет справедливо, как я уже писал выше, ведь у солдат войны одни и те же проблемы.

Необходимо также создать книгу Памяти об Афганистане, в которой будут имена каждого погибшего солдата, каждого пропавшего, умершего после войны, и список всех участников войны. Это будет история о каждом из нас. И надо это делать сейчас, пока еще живы солдаты.

А почему бы нашей киностудии "Беларусьфильм" не создать картину про Афганистан? Посмотрите, как "9-ю роту" талантливого режиссера Федора Бондарчука восприняли в России и в Беларуси. Его фильм был удостоен премии "НИКА" как лучшая картина 2006 года. Я думаю, что историй из реальной жизни ребят-"афганцев" у нас найдется на сотню сценариев.

Америка, признавшая, что война во Вьетнаме была проиграна, не предает своих солдат. Сколько фильмов на эту тему снято! Вот и нам надо учиться популяризировать героизм офицеров и солдат. Люди должны увидеть, с какими проблемами сталкивается человек на войне, как он меняется (или не меняется), о чем он думает и что для него является смыслом жизни. Государство до сих пор этого не поняло. Ведь молодежь не хочет служить в армии еще и потому, что она видит равнодушное отношение к ветеранам любой войны.

Следующий шаг — необходимо создать программу на телевидении о людях, прошедших войну, об их дальнейшей жизни, о том, кем они стали. Передачу, которая говорила бы о проблемах ветеранов, показывала, как живут родители погибших солдат, и рассказывала обо всем том, что связано с войной. И в этой программе могли бы выступать сотрудники силовых ведомств, которые также рискуют своей жизнью в мирное время во имя закона и правопорядка в стране. И про них не надо забывать. Я думаю, что у такой программы был бы хороший рейтинг. А ведь когда-то все это у нас было...

Почему бы Министерству обороны Республики Беларусь не взять на себя инициативу и не продумать, как сделать Марш солдат. Каждый год на 9 Мая государство организовывает такие Марши для ветеранов Великой Отечественной войны. Пусть и наши ребята наденут свои награды и пройдутся по главному проспекту вместе со своими детьми и женами. Вот это я понимаю — уважение к солдату.

А еще я заметил, как быстро отрезвила нас власть — среди "афганцев" уже появились желающие баллотироваться этой осенью в депутаты парламента. Смотришь, через пару лет найдутся среди нас уважаемые люди, которые смогут выдвинуть свою кандидатуру на пост президента страны. Я думаю, что шансы у такого кандидата стать президентом будут высоки — наш народ всегда поддержит защитников Отечества.

Я благодарю всех тех, кто не остался равнодушным к моей статье. Я предлагаю: давайте публиковать в газете "Народная воля" свои очерки под рубрикой "Неизвестная афганская война". Знаю, в редакции будут приветствовать такие авторские материалы из личной жизни солдата. Пусть люди больше узнают об этой драматической истории белорусского народа — войне в Афганистане.

Олег ВОЛЧЕК,
рядовой, стрелок мотоманевренной группы "Даргак" ПВ КГБ СССР (провинция Куфаб, Афганистан,1986 год).

Мой контактный телефон: 8-029-650-57-86.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Зміцер ЖАЛЕЗНІЧЭНКА:

«Я хачу служыць у арміі, дзе загады аддаюцца па-беларуску»

Проста немагчыма было сачыць за падзеямі вакол гомельскага актывіста Дзмітрыя Жалезнічэнкі, з такой хуткасцю яны развіваліся. Спачатку Дзмітрыя аднавілі ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце, потым раптоўна выключылі ізноў і... хуценька прызвалі ў армію. У сувязі з усімі гэтымі падзеямі хлопец абвясціў галадоўку.

Дваццацігадовы Зміцер Жалезнічэнка з'яўляўся студэнтам матэматычнага факультэта ГДУ. У выкладчыкаў і аднагрупнікаў Жалезнічэнка быў на добрым рахунку, бо хлопец быў выдатнікам, хаця ніколі не ўтойваў, што з'яўляецца сябрам Партыі БНФ і мае пэўную грамадзянскую пазіцыю.

Здавалася, фармальных падстаў для адлічэння маладзёжнага актывіста няма, бо, як сцвярджаюць чыноўнікі самага высокага рангу, "за палітыку" ў Беларусі з ВНУ нікога не выключаюць. Аднак...

Першы раз студэнта-выдатніка Жалезнічэнку адлічылі з навучальнай установы яшчэ восенню мінулага года. Падставай стала "сістэматычнае парушэнне універсітэцкіх правілаў унутранага распарадку". Аднак гэтае рашэнне Жалезнічэнка абскардзіў у судзе. Дзіўна, але суддзя суда Цэнтральнага раёна Гомеля Віктар Казачка аднавіў Жалезнічэнку ў правах студэнта. Адбылося гэта 18 студзеня.

Аднак студэнтам Зміцер пабыў усяго некалькі дзён. 22 студзеня з'явіўся новы загад рэктара Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Прычына адлічэння — усё тое ж невыкананне ўнутрыуніверсітэцкіх правілаў. А ўжо 25 студзеня Жалезнічэнка атрымаў позву ў ваенкамат аб прызыве на тэрміновую вайсковую службу. У ваенкамат разам з Жалезнічэнкам прыехаў і ягоны сябар Андрэй Цанюта. *"Я, напэўна, адзін з апошніх, хто бачыў Зміцера да таго, як яго "прызвалі ў войска"*, — распавёў карэспандэнту "Народнай волі" Цанюта. — *Зміцера выклікалі ў ваенкамат дзеля праходжання медыцынскай камісіі. Ён паспеў паведаміць мне, што да яго прыставілі нейкага чалавека, які разам з ім хадзіў па кабінетах. Паказальна і тое, што з загадам аб паўторным адлічэнні з універсітэта Жалезнічэнку азнаёмілі ўжо ў ваенкамаце. Сюды спецыяльна прыехаў начальнік юрыдычнага аддзела навучальнай установы Валерый Недаступ, які "пад подпіс" паказаў Жалезнічэнку загад рэктара".*

У дзень праходжання медкамісіі ў ваенкамаце Дзмітрый адчуваў сябе хворым — скардзіўся на павышэнне крывянога ціску, галаўны боль. *"Але яго і слухаць не сталі. Хаця ў яго на руках і даведка адпаведная была,* — распавядае Андрэй Цанюта. — *Зміцеру адмовілі ў паглыбленым медыцынскім абследаванні. І пад даглядам афіцэра накіравалі ў Жлобін. Яго размеркавалі ў чыгуначныя войскі".*

Паказальна, што прызыў у армію для Дзмітрыя Жалезнічэнкі адбыўся настолькі хутка, што хлопец нават не паспеў абскардзіць рашэнне суда аб сваім адлічэнні. "Апошняе, што ён паспеў мне паведаміць, — гэта тое, што распачынае бестэрміновую галадоўку ў сувязі з парушэннем ягоных правоў, — працягвае Цанюта. — А яшчэ мне вядома, што Зміцер адмовіўся падпісваць вайсковы білет, які яму выдалі на расійскай мове, бо Жалезнічэнка неаднаразова падкрэсліваў, што будзе служыць толькі ў беларускім войску, дзе загады аддаюцца па-беларуску".

Вядома, што ў мінулую нядзелю з Дзмітрыем бачылася ягоная маці — спадарыня Ала. Яна ўгаворвала сына спыніць галадоўку, але той адмовіўся і настойвае на выкананні сваіх патрабаванняў. Яшчэ да таго, як Жалезнічэнку забралі ў войска, ён заяўляў:

"Калі так атрымліваецца, што трэба служыць, я хачу служыць толькі ў беларускім войску. Бо, калі мне трэба будзе служыць у расійскім войску, я паеду ў Маскву і буду служыць там адзін год. На расійскай мове я служыць не буду. Такая мая катэгарычная пазіцыя, і я ад яе адмаўляцца не збіраюся, нават нягледзячы на тое, што да мяне, напэўна, будуць прымацца жорсткія санкцыі".

Адпаведную заяву Зміцер Жалезнічэнка падаў у ваенкамат, копію — міністру абароны. Акрамя таго, Жалезнічэнка спасылаецца на артыкул 36 Канстытуцыі, дзе запісана, што ваеннаслужачыя не могуць быць сябрамі палітычных партый, а Зміцер - сябра Партыі БНФ. Вось такі адбыўся казус...

Калі гэты матэрыял рыхтаваўся да друку, высветлілася, што Зміцера Жалезнічэнку са Жлобіна перавялі ў Мінск і паклалі ў вайсковы шпіталь. Хлопец знаходзіцца ў аддзяленні кардыялогіі. *"Да яго нікога не пускаюць, у вайсковым шпіталі зараз каранцін",* — распавяла днямі "Народнай волі" маці Дзмітрыя.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ДАРЭЧЫ

У сваю чаргу вайскоўцы папярэдзілі Жалезнічэнку аб крымінальнай адказнасці. З нагоды галадоўкі беларускамоўнага навабранца кіраўнік прэс-цэнтра Міністэрства абароны палкоўнік Вячаслаў Раменчык заявіў наступнае:

"Жалезнічэнка парушае закон. У прыватнасці, у адпаведнасці з артыкулам 447 Крымінальнага кодэкса ён падлягае крымінальнай адказнасці за наўмысную шкоду свайму здароўю ў мэтах ухілення ад вайсковай службы. Яму будуць даведзены гэтыя патрабаванні, і далей камандзірам часці будуць рабіцца адпаведныя захады".

Народная Воля http://www.nv-online.info
31 СТУДЗЕНЯ 2008 г.

РЕПЛИКА

Как «единый» отказался поставить свою подпись

Казалось бы, самое время вспомнить о тех политзаключенных, кто не имеет возможности участвовать в повседневной жизни хотя бы на правах обычного гражданина. Это мы и попытались сделать, номинируя А.Козулина на Нобелевскую премию Мира-2008. И тут произошло неожиданное. Бумагу с обращением к Альберту Гору с просьбой выдвинуть Козулина на Нобелевскую премию по нашему замыслу должны были подписать полтора десятка человек, так сказать, наиболее яркие представители белорусской интеллигенции, журналистики и руководители партий. Но один человек наотрез отказался поставить свою подпись, даже не взглянув на бумагу. Он сообщил о своем решении через помощника, мотивируя отказ тем, что уже подписывал обращение-ходатайство за другого человека.

Пройдя все инстанции (направив более 20 заявлений в вышеперечисленные министерства и ведомства), получив в ответ безосновательные, формальные отписки, я пришел к выводу, что законы пишутся только для обыкновенных граждан, чиновники их могут не соблюдать. Но я выполнил свой гражданский долг. А ведомства прекратили со мной всякую переписку. И все-таки надеюсь, что это письмо прочтет тот, кто даже для Комитета государственного контроля является вышестоящим руководителем. И к кому по рекомендации работников Комитета я могу обратиться.

Георгий ЮРОНОК.
Минск.

Народная Воля http://www.nv-online.info
31 СТУДЗЕНЯ 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

Альтернативные источники энергии невозможно было бы развивать при цене на нефть в 20 долларов

Такое мнение высказал в интервью Euronews испанец Хоакин Альмуния — комиссар ЕС по вопросам экономики и денежно-кредитной политики. Вот фрагменты из этой беседы.

"ЕвроНьюс": — Если говорить о нефти, мы что, должны привыкнуть к этому ценовому уровню?

Хоакин Альмуния: — Мы сейчас живем в период более дорогой нефти, чем в прошлом. И это будет продолжаться потому, что, с одной стороны, существует очень высокий спрос, быстро растет экономика и, я надеюсь, продолжит расти, появились новые страны, которые потребляют много нефти: Китай, Индия и другие развивающиеся экономики.

Поэтому мы проходим период более дорогой нефти с определенными трудностями, но в то же время здесь есть и некоторые выгоды. Давайте посмотрим на один из таких плюсов — это настоящий стимул к развитию альтернативной энергии, неуглеводородной, без выбросов углекислого газа в атмосферу, лучшей с экологической точки зрения. С экономической точки зрения было бы невозможно развить альтернативные и возобновляемые источники энергии при цене на нефть в 20 долларов.

— Но в этом и заключается проблема для европейских граждан, не так ли?

— В краткосрочной перспективе, несомненно, это является проблемой. Мы видим, насколько повысились цены на энергию и как они подгоняют цены на зависящие от нефти товары. И такое положение будет сохраняться, пока цены на нефть останутся высокими. Но это открывает и новые возможности. Например, после первого нефтяного рывка в 1973—1974 годах к сегодняшнему дню мы смогли наполовину уменьшить количество нефти, необходимой нам в производстве. Мы должны это продолжать и не только потому, что это — дорогая энергия, но также в связи с экологическими проблемами.

— Рост цен на нефть, а также на продукты питания вызывает риск инфляции. Это очень волнует европейских потребителей. Что вы думаете об этом?

— Несомненно, с ростом цен на нефть связан и рост цен на другие товары, на продукты питания. Инфляция в зоне евро выросла с августа до конца 2007 года на 1%. До этого ее уровень находился в районе 2% и даже спускался ниже этой отметки, но в настоящее время она достигла 3,1%. Тем не менее это происходит не только в Европе или в еврозоне, это происходит везде.

— В прошлом мы видели, что во многих случаях кризисы в мире были спровоцированы плохим функционированием сектора кредитов. Не думаете ли вы, что новая система координации мировой экономики должна будет противостоять кредитной проблеме на мировом уровне?

— Многое из того, что играло роль в прошлом, может исчезнуть как следствие процесса обновления, процесса изменений и адаптации к новым условиям. В настоящее время можно увидеть, что из-за этих финансовых неприятностей есть очень много финансовых учреждений, которые несут потери, но есть и другие, которые на этом выигрывают. Вероятно, в этом процессе будет нанесен удар и по некоторым финансовым продуктам. Сейчас есть идеи, инициативы и предложения по улучшению работы. Так что через несколько лет мы увидим другую финансовую систему, более эффективную, чем нынешняя.

Европейский план борьбы с потеплением

Председатель Европейской комиссии Жозе Мануэль Баррозу объявил "исторический план", который, по его словам, может сделать Европу мировым лидером в борьбе с глобальным изменением климата.

По словам Баррозу, у ЕС есть план действий, который будет стоить каждому европейцу 3 евро (4,3 доллара) в неделю. Цель — сократить выбросы парниковых газов на 20% к 2020 году. С учетом глобального соглашения ЕС может скорректировать свои планы и снизить выбросы на 30%.

Этого же добиваются и экологи. *"Ученые подсчитали, что для предотвращения климатической катастрофы необходимо сокращение выбросов минимум на 30%",* — говорит Тони Джунипер, директор британской организации "Друзья земли". По его словам, пути решения проблемы уже найдены: *"Нам не хватает политической воли и смелости".*

Глава Еврокомиссии также заявил, что в ближайшее время должны начаться консультации о сокращении выбросов в два раза к 2050 году. И, как считает Баррозу, Европа должна этот процесс возглавить.

Если богатые страны должны будут сократить выбросы (например, Великобритания на 16%, а Дания или Ирландия на 20%), то самым бедным разрешат увеличить выбросы (Болгарии на 20%, а Румынии на 19%).

Каждой стране также устанавливается цель по развитию возобновляемой энергии. Доля таких источников в энергетическом секторе Великобритании должна составлять 15%. Более прогрессивная в этом отношении Швеция должна довести эту долю до 49%.

Странам также позволят обмениваться инвестициями в развитие возобновляемых источников энергии. Кроме того, подтверждена цель перевести 10% дорожного транспорта ЕС на биологическое топливо.

Чтобы проект, представленный Комиссией, вступил в силу, его должен рассмотреть Европарламент, а также утвердить страны — участники ЕС. В любом случае проект вступит в силу не раньше конца 2009 года, заключает Би-Би-Си.

Предложениями Еврокомиссии довольны далеко не все. Промышленники заявляют, что планируемые меры негативно отразятся на их конкурентоспособности. По их словам, компаниям придется в этом случае либо вывести свои предприятия из Европы, либо проиграть в конкурентной борьбе. Защитники окружающей среды заявляют о чрезмерной мягкости такого подхода и говорят, что для предотвращения климатической катастрофы необходимо еще больше сократить выбросы и активнее использовать возобновляемые источники энергии.

Обращаясь к критикам европейских инициатив, выразившим опасения, что в новых условиях ЕС потеряет все промышленное производство, он отметил, что энергоемкие производства получат определенные льготы. *"Мы не хотим экспортировать наши рабочие места в другие части мира",* — заявил глава Еврокомиссии.

Так поступают джентльмены

Министр труда Великобритании Питер Хейн ушел в отставку после того, как избирательная комиссия направила в полицию материалы, касающиеся использования им в ходе прошлогодней предвыборной кампании незадекларированных пожертвований.

"Я глубоко раскаиваюсь в допущенной ошибке, которая заключалась в том, что я поздно задекларировал перечисленные пожертвования", — заявил Хейн, пообещав всячески содействовать расследованию истории, которой теперь займется полиция.

В прошлом году Хейн выставлял свою кандидатуру на пост заместителя лидера Лейбористской партии и, как и другие претенденты, получал пожертвования от своих сторонников. Но изначально он задекларировал лишь часть полученных средств в размере 82 тысяч фунтов стерлингов, не сообщив при этом еще о 103 тысячах. Впоследствии министр внес недостающую сумму в декларацию, но опоздал со сдачей документов.

В послании премьер-министру Гордону Брауну Хейн указал, что в свете решения избирательной комиссии у него не оставалось иного выбора, как подать в отставку. Браун, со своей стороны, заявил, что Хейн, пойдя на такой шаг, "как всегда, поставил интересы страны выше своих собственных", передает Euronews.

ФОТОФАКТ

Афганские вдовы стоят в очереди за продуктами, распределяемыми международной организацией CARE.

Тысячи палестинцев ринулись сквозь пробоины в стене на границе с Египтом, чтобы закупить продукты.

Час Каспия

Каспий вновь фигурирует в повестке дня мировой энергетики. Регион, богатый нефтью и газом, устремляется вперед, расставаясь со своим советским прошлым. Однако еще есть неразрешенные вопросы.

Для Азербайджана интеграция на региональном уровне — один из приоритетов. Но она станет возможной лишь тогда, когда мы сможем найти прочное решение конфликта, касающегося Нагорного Карабаха.

Когда в 1992 году эту область на юго-востоке страны и еще семь прилегающих к ней территорий заняли армянские войска, почти 1 млн азербайджанцев был вынужден бежать. Теперь они живут во временных поселениях. Им следует разрешить вернуться в их дома.

Азербайджан не может идти ни на какие компромиссы, когда дело касается его территориальной целостности и права на возвращение для людей, которые стали перемещенными лицами. Это отвечает нормам и принципам международного права, соответствующим резолюциям Совета Безопасности ООН, а также решениям, которые были приняты Организацией по безопасности и сотрудничеству в Европе. Другие международные организации, в том числе НАТО, Совет Европы и Европейский Союз, неоднократно заявляли то же самое.

Необходимо срочно завершить этот процесс. Поддержание нынешнего положения дел обходится слишком дорого.

В данный момент рыночные цены на нефть и газ высоки и следовало бы иметь возможность для максимального использования экономического потенциала стратегических ресурсов. Однако неразрешенный Нагорно-Карабахский конфликт угрожает безопасности существующей инфраструктуры трубопроводов, не позволяя оптимизировать продажу энергоносителей в Европу. При всем при том армянской стороне следует знать, что мы готовы предоставить Нагорному Карабаху максимально возможную автономию в составе Азербайджана. Мы даже готовы значительно увеличить средства, выделяемые центральными властями на развитие этой провинции Азербайджана.

Урегулирование этого "замороженного конфликта" также поможет Азербайджану взять на себя роль моста между ЕС и Центральной Азией. По мере того, как ЕС расширяется на восток, все более растет значение Центральной Азии, богатой нефтью и газом. ЕС должен быть сильно заинтересован в стабильности и экономическом развитии региона, который, возможно, сыграет стержневую роль в содействии удовлетворению потребностей Европы в энергоносителях.

Вместе с партнерами из Казахстана и Туркмении Азербайджан строит сильное и подлинное транскаспийское партнерство. Обсуждается идея о соединении двух берегов Каспийского моря сетью трубопроводов. Прикаспийский регион окружен такими мощными экономиками, как ЕС, Турция, Россия и Китай, так что перспективы быстрого и постоянного роста в этом регионе выглядят более чем убедительными.

Виды на более тесную экономическую интеграцию в Европу для Прикаспийского региона не менее важны, чем партнерство с Россией и Китаем. Азербайджан твердо привержен делу укрепления всех этих связей. Однако подлинные региональные основы процесса зависят от разрешения Нагорно-Карабахского конфликта, и потому эта проблема больше не может ждать. Баку со всей серьезностью настроен двигаться дальше.

Эльмар МАМЕДЬЯРОВ — министр иностранных дел Азербайджана.

The Wall Street Journal

Мировая сенсация: будем жить 800 лет?

"Подредактировав" нашу ДНК, мы вскоре сможем продлить свою жизнь на сотни лет — если захотим. Стив Коннор сообщает о революционном открытии, которое вызвало раскол в научном мире. Об этом пишет Independent.

Калифорнийские ученые создали генетически модифицированный живой организм, способный жить в 10 раз дольше, чем ему положено. Это наибольшее продление срока жизни, которого удалось достичь исследователям, исследующим механизмы старения. Если когда-либо удастся применить эту методику к людям, то когда-нибудь они смогут доживать до 800 лет. Но реалистична ли эта перспектива?

Валтер Лонго — один из небольшой, но влиятельной группы специалистов в данной области, полагающих, что жить 800 лет не просто возможно, но и неизбежно. Именно его работы в университете Южной Калифорнии повлекли за собой создание штамма дрожжевого грибка, который может жить 10 недель или еще дольше, тогда как обычный грибок живет максимум неделю.

Вычеркнув из генома грибка два гена и посадив его на низкокалорийную диету, Лонго сумел в десять раз продлить срок жизни самых обычных дрожжевых клеток, которыми пользуются пекари и пивовары. Результаты исследования опубликованы в журнале Public Library of Science Genetics.

Конечно, разница между дрожжевой клеткой и человеком огромна, но это не помешало Лонго и его коллегам заявить, что их исследования имеют непосредственное отношение к проблеме старения и долгожительства людей. *"Мы закладываем основы для перепрограммирования организма на здоровую жизнь. Если мы сможем разобраться, как работает механизм долгожительства, его удастся применить ко всем клеткам любого живого организма",* — говорит Лонго.

Большинству геронтологов — исследователей, которые занимаются проблемой старения, — подобные заявления кажутся почти ересью. В данной области устоялось мнение, что максимальная продолжительность жизни человека не превышает 125 лет.

Отношение большинства геронтологов-"центристов" к идее, что когда-нибудь люди смогут жить по нескольку веков или даже тысячу лет, как предположил некий ученый-нонкомформист, — лучше всего выразил Робин Холлидэй, видный британский геронтолог, в своей новой книге "Старение: парадокс жизни". *"Как можно делать такие заявления?* — вопрошает Холлидэй. — *Первое условие — игнорировать колоссальный корпус опубликованных исследований процесса старения. Второе — игнорировать громадный свод информации, полученной путем изучения заболеваний человека, обусловленных возрастными изменениями; другими словами, игнорировать массу хорошо обоснованных учебников по патологии человека ".*

Лонго убежден: его эксперименты с модификацией генов дрожжевого грибка свидетельствуют, что старение — не просто побочный эффект жизни, но целенаправленный, генетически запрограммированный процесс, отшлифованный естественным отбором: *"Организмы, которые мы изучаем, умирают задолго до положенного им срока, чтобы снабдить пищей "мутантов", порожденных в среде их собственной популяции. Таким образом, миллиарды организмов умирают рано, чтобы кучка более приспособленных к жизни особей могла расти".*

Это наводит на предположение, что то же самое происходит среди людей, так что многие люди умирают раньше, чем необходимо. *"Если у дрожжевого грибка старение запрограммировано, а метаболический механизм очень похож на человеческий, то разве не может быть, что люди тоже умирают прежде срока?"*

ДЫЯЛОГ

Размова паміж Мінскам і Бруселем

Эксперты Еўракамісіі, якія займаюцца энергетыкай і транспартам, правялі ў Мінску сустрэчы з прадстаўнікамі адпаведных беларускіх міністэрстваў.

Афіцыйны сайт Прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Кіеве, якое ахоплівае сваёй дзейнасцю і Беларусь, размясціў каментарый да гэтай падзеі еўракамісара па пытаннях знешніх дачыненняў і еўрапейскай палітыкі суседства Беніты Ферэра-Вальднер. Яна адзначае: "Правядзенне тэхнічных сустрэч паміж экспертамі з абодвух бакоў магло б стварыць падмурак для істотнага супрацоўніцтва ў рамках поўнага партнёрства пры ўмове, калі Беларусь зробіць крокі ў кірунку дэмакратызацыі".

Дарэчы, 7- лютага ў Бруселі пройдзе аналагічная сустрэча спецыялістаў у галіне экалогіі.

КАЛЕЙДОСКОП

Невеста на... поводке

В британском графстве Йоркшир недавно обручившуюся пару "готов" не пустили в пассажирский автобус. Водителю не понравилось, что 25-летний Дэни вел свою 19-летнюю невесту Ташу на поводке, пишет газета The Daily Mail.

По словам пострадавших, водитель оттолкнул их от автобуса, сказав, что ненормальным не место в общественном транспорте. Некоторое время спустя другой водитель отказался ехать дальше, когда парочка все же села в автобус, несмотря на его протесты.

Молодые люди обратились с жалобой на дискриминацию в автобусную компанию, где им заявили, что серьезно воспринимают подобные обвинения и проведут расследование.

После разговора с водителем представитель компании объяснил, что тот принял решение в целях безопасности пассажиров и самих "готов", сообщает BBC News. По его словам, опасная ситуация могла возникнуть, если автобус резко затормозит, а Дэни в этот момент будет держать Ташу на поводке.

Учитывая проявленную водителями грубость, компания пообещала написать пострадавшим письмо с извинениями за неподобающее обращение.

Хотите в космос?

Билеты на орбиту всего за 200 тысяч долларов будут продаваться уже в следующем году, утверждает британец Ричард Брэнсон. Миллиардер представил модель космического корабля для туристов.

По данным НТВ, ракетоплан "Спейс Шип-2" рассчитан на шесть пассажиров. Он будет стартовать не с Земли, а из-под крыла специального самолета "Белый рыцарь". Ракетный двигатель позволит кораблю достичь высоты в 100 километров. Именно там, по мнению ученых, начинается космос.

Путешествие в невесомости будет коротким — всего шесть минут. После этого "Спейс Шип" начнет падение и спланирует на аэродром. В отличие от множества других энтузиастов космического туризма, Ричард Брэнсон готов ответить за свои слова. Он уже купил землю под космодром в штате Нью-Мексико и заказал строительство первого челнока.

Кто такая Карла Бруни?

О романе президента Франции Николя Саркози и Карлы Бруни судачат не только в этой стране, но и в мире. Но кто такая Карла Бруни? Этим вопросом заинтересовалась Би-Би-Си.

Она родилась в итальянском городе Турине в 1967 году в семье музыкантов. Ее мать была пианисткой, отец — композитором, который к тому же унаследовал компанию Ceat, одного из крупнейших производителей шин в Италии. Старшая сестра Бруни — Валерия — известная в Италии актриса.

В 1970-х годах семья Бруни-Тедески из-за опасности похищения, исходившей от группировки "Красные бригады", перебралась во Францию. Еще подростком Карла Бруни пошла в модельный бизнес и работала с известными модными брендами. Позировала она вполне успешно — в 1990-х годах вошла в список самых высокооплачиваемых моделей мира.

Личная жизнь ее также была поводом для зависти многих. Рок-звезды, актеры, правящая элита — обычная для Карлы свита. В разное время ею были очарованы музыканты Мик Джаггер и Эрик Клэптон, актеры Кевин Костнер и Венсан Перес, миллиардер Дональд Трамп и бывший французский премьер-министр Лоран Фабиус. Так что назвать роман Бруни с президентом Франции особой удачей, наверное, нельзя — скорее естественным продолжением коллекции.

В прошлогоднем интервью журналу Le Figaro Madame она сказала о том, что моногамия ей быстро надоедает, при этом добавила: *"Любовь может длиться долго, а страсть — лишь пару недель".*

В 2001 году, когда Карла Бруни жила с французским публицистом Жан-Полем Энтховеном, она завела роман с его сыном Рафаэлем — подающим надежды 24-летним философом, который был на 10 лет моложе Карлы.

Брак, в котором тогда состоял Рафаэль Энтховен, оказался в итоге разрушен. Жена Рафаэля

— интеллигентная Жюстин Леви, дочь другого известного философа Франции, — не выдержала конкуренции с топ-моделью. Отомстила Жюстин в свойственной ее семье манере. Она не стала устраивать сцен ревности, а выпустила книгу под названием "Ничего серьезного", которая рассказывает о молодой женщине, мужа которой украла нахальная женщина-вамп с *"улыбкой терминатора".*

В 2001 году у Карлы и Рафаэля родился сын, после этого они расстались.

В конце 1990-х Бруни оставила мир моды. Пользуясь своей родословной и связями, она открыла в себе талант певицы.

Ее дебютный альбом, продюсером которого был, конечно же, еще один бывший любовник Карлы, Жан-Луи Бертиньяк, стал хитом в 2002 году. Второй альбом, вышедший пятью годами позже, был продан тиражом два миллиона копий.

Народная Воля http://www.nv-online.info
31 СТУДЗЕНЯ 2008 г.

Галіна Пазьняк

Беларусь у сэрцы

**(Працяг.
Пачатак у №№7—8, 9—10.)**

Тое, што Сяргей амаль не працуе на сваёй акрузе, дзівіла, я нават падумала, а ці хоча ён увогуле стаць фронтаўскім дэпутатам. Але ў тым жыцьцёвым рытме было не да "доўгіх разваг". Мы ўсе "сьпяшаліся" і "без працы" не былі ніколі (ня там, дык тут). (А вось калі на выбарах Сяргей "не прайшоў", паверыць у гэта і "пагадзіцца" ўсім нам было вельмі цяжка, хоць мы і разумелі, ды і сам Сяргей гэта прызнаваў, што так сталася ў выніку слабой агітацыйнай кампаніі на яго выбарчым участку.)

Асабліва запомнілася мне, як мы змагаліся за вылучэньне ў кандыдаты Валянціна Голубева. Гэта была агульная фронтаўская барацьба.

Заля адной са школаў Паўднёвага Захаду была поўнай, а мы ўсё яшчэ хадзілі па дамах і запрашалі людзей (на выпадак, калі камуністам ўдасца зацягнуць час і людзі пачнуць разыходзіцца).

Пачалося вылучэньне кандыдатаў. Іх назьбіралася больш за дзясятак. Потым — выступы вылучэнцаў, потым выступы з залі: адзін у падтрымку, адзін супраць.

Выступ Валянціна Голубева быў добры, але ж і апанэнты "не драмалі". У залі хапала "людзей у цывільным" і памагатых. Мы хваляваліся за галасаваньне. І тут нечакана прыехаў Зянон Пазьняк (гэта, дарэчы, ён угаварыў маладога камуніста-беларуса і навукоўца Голубева уступіць у Фронт і балатавацца ў дэпутаты). Зянон Пазьняк выступіў у падтрымку Валянціна. Заля літаральна ўзарвалася апладысьмэнтамі. Перамога была забясьпечана, і кандыдатам у дэпутаты сход выбаршчыкаў выбраў Валянціна Голубева.

Паколькі цэнтр Койданаўскай Рады БНФ Менска канцэнтраваўся на Паўднёвым Захадзе, амаль кожны дзень я езьдзіла туды на гарадзкім транспарце, бо жыла на адлегласьці 7—10 тралейбусных прыпынкаў ад сваіх сяброў, у раёне вуліц Люксембург—Лермантава, і на пачатку была ў сваім раёне адзінай фронтаўкай. Калі сябры прапанавалі мне вылучыцца кандыдатам у дэпутаты Гарсавета па месцы жыхарства (у Вярхоўны Савет у маім раёне Фронт вылучыў В.Вячорку), я разгубілася. З аднаго боку я разумела, што нельга аддаваць округу камуністам і трэба змагацца. Але ж я тут была адна. "Чаго ты баішся, мы ж будзем з табой разам", — сказалі сябры. І я пагадзілася.

Маім вылучэньнем займаўся Сяргей Міхноў. Ён знайшоў нейкі каапэратыў, працоўны калектыў якога мяне і вылучыў — рэдкі выпадак, калі людзі не пабаяліся вылучыць фронтаўку.

Я здала ў выбарчую камісію неабходныя дакументы, і неўзабаве мне выдалі пасьведчаньне кандыдата ў дэпутаты Менгарсавета па 75-й Лермантаўскай акрузе.

І сапраўды, не было выпадку, калі б я засталася адна ў "сваёй выбарчай кампаніі". Здаецца, на маю выбарчую округу зьязджаліся ледзь ня ўсе койданаўцы. Запомнілася, як аднаго разу ішоў сьнег з дажджом і на вуліцы было вельмі мокра і няўтульна. Я чакала сяброў пасьля працы, але ня вельмі спадзявалася, што хто-небудзь прыедзе. Прыехала ж чалавек дзесяць. Мы хадзілі па дварах зь мегафонамі, гаварылі зь людзьмі ў дварах. Часам некаторыя выходзілі да нас паглядзець як на дзіва: такая непагадзь, а яны — пра выбары. Дзівакі!

А мы не шкадавалі сіл для будучыні. Часамі я стамлялася так, што дома вечарам так і засынала ў крэсьле. А назаўтра — ізноў праца ў акрузе дапазна. Тады было так. Аднекуль браліся сілы, якія перамагалі і грыпу, і кашаль, і неверагодную стому. Немагчымае станавілася магчымым.

ВЫБАРЫ-90

Папярэднія вынікі выбараў, як правіла, становяцца вядомымі ноччу, у дзень выбараў. Мы чакалі агульных вынікаў, бо ніхто не перажываў "за сябе", усе хваляваліся за Фронт. У гэтую ноч да фронтаўскай інфармацыі дазваніцца было складана. І вось першыя зьвесткі: Пазьняка выбралі з першага туру галасаваньня!

Але далей мы даведаліся, хто з фронтаўскіх кандыдатаў, адзін за другім, "не прайшоў" на другі тур, ці, дакладней сказаць, каму не далі прайсьці: падліковыя камісіі ўсе былі "схопленыя" КПБ. Гэта быў першы, вельмі моцны ўдар. І ня ўсе яго здолелі вытрымаць...

Потым пачаліся бясконцыя новыя і новыя давыбары, але істотна павялічыць Апазыцыю БНФ у Вярхоўным Савеце не ўдалося.

Не прайшла ў Гарсавет і я. Выбары па маёй акрузе абвясьцілі не адбыўшымися, бо ў галасаваньні прыняло ўдзел менш 50 адсоткаў выбаршчыкаў, хоць у выніку галасаваньня па маёй акрузе сярод пяці кандыдатаў перамога была за мной.

Праз два месяцы былі абвешчаныя дадатковыя выбары. Сябры прапанавалі мне паспрабаваць яшчэ раз, каб (калі ўжо ня выйграць), дык ня даць прайсьці намэнклятуры. Я пагадзілася. І пачаліся ізноў цяжкія дні працы ў дварах, на сходах, на мітынгах. Як заўсёды, са мной былі мае сябры-фронтаўцы. У дзень выбараў яны наладзілі сур'ёзны кантроль за галасаваньнем і падлікам галасоў на выбарчых участках. Мы (чалавек дзесяць) чакалі вынікаў у мяне дома. Каля першай ночы вынікі сталі вядомыя. Я перамагла трох канкурэнтаў.

Мы абдымаліся, сьмяяліся, гаварылі, гаварылі. Кожны з маіх сяброў радаваўся за маю перамогу, як за асабістую, бо ўспрымалі яе як перамогу Фронту. Разьвітваючыся з сябрамі, я запэўніла, што ўся мая дзейнасьць у Гарсавеце будзе ад імя Фронту і дзеля Беларусі.

АНТЫКАМУНІСТЫЧНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ — 90

У гэтым жа 1990-м кіраўніцтва Фронту вырашыла правесьці ў Менску ўсебеларускую антыкамуністычную дэманстрацыю і мітынг якраз на 7 лістапада (у дзень кастрычніцкага бальшавіцкага перавароту 1917 года). Заяўнікамі былі чалавек 5—6 дэпутатаў-фронтаўцаў Вярхоўнага Савета (З.Пазьняк, В.Голубеў, Л.Баршчэўскі, Г.Сямдзянава і яшчэ некалькі чалавек). У сьпісе заяўнікаў стаяла і маё імя як дэпутата Менгарсавета.

Дэманстрацыю, як ня дзіўна, дазволілі (ізноў "падставіўся" шчыры наш Аляксандар Міхайлавіч Герасіменка), бо, відаць, тагачасная камуністычная ўлада і падумаць не магла, якія маштабы прыме гэтая акцыя і якія незваротныя вынікі ад яе чакаюць беларускае грамадзтва. А падзея атрымалася знакавай.

Было вырашана ісьці не традыцыйна — ад плошчы Незалежнасьці (тады пл. Леніна) да Круглай плошчы, — а наадварот, да Вярхоўнага Савету. Таму менчукі і антыкамуністы з усёй Беларусі зьбіраліся нараніцы на плошчы Якуба Коласа.

Як заўсёды, нашую калёну суправаджала фронтаўская Дружына, бо кіраўніцтва адраджэнцкага руху вельмі дбала як за парадкам падчас фронтаўскіх масавых мерапрыемстваў, так і за ягонай "эстэтыкай". (Потым гэта стала нашай добрай фронтаўскай традыцыяй на ўсіх нашых акцыях: парадак, чысьціня, культура паводзінаў і прыгожы агульны выгляд нашых калёнаў ці "плошчаў".)

Фронтаўская калёна рушыла вельмі арганізавана і была афармлена рознымі антыкамуністычнымі транспарантамі, распрацаванымі беларускімі мастакамі. Луналі нацыянальныя сьцягі. Мы ішлі па праспэкце Францыска Скарыны (тады Леніна) вясёлыя, з радасьцю дэманстравалі канец камунізму. Людзі увесь час скандавалі антыкамуністычныя лёзунгі: "Далоў КПСС!", "Камуністы — вон зь Беларусі!" і г.д. Такое масавае шэсьце супраць КПСС (тысячаў 30—40 чалавек) — было ўпершыню. Жыхары дамоў уздоўж праспэкту "абляпілі" вокны, бальконы. Нас віталі і падтрымлівалі, а ад калёны гучна разносілася: "Хадзем з намі! Хадзем з намі!"

Калі мы дасягнулі будынка КДБ, тут беларускаму гумару ў калёне не было канца. Перапужаныя кадэбэшнікі не маглі ўцяміць, што адбываецца, чаму людзі, маса людзей, рагоча зь іхных высунутых у вокны вушэй, акругленых вачэй і разьзяўленых ратоў. "Што гэта, землятрус?" — чыталі мы на іхных паўпрытомных тварах. А у адказ чулася: "Далоў камунізм!", "Хадзем з намі!" Карціна была сьмешная, і дэманстранты проста рагаталі з яшчэ ўчора "грозных" служкаў таталітарнага рэжыму.

На плошчы Леніна пачаўся мітынг. Дэпутаты прамаўлялі, заклікалі беларусаў разьвітацца з цяжкім камуністычным мінулым. Зьявілася міліцыя і стала ў дзьве шэрэнгі ўздоўж вуліцы "Советской", "баронячы" чорны помнік Леніну.

Пазьняк зьвярнуўся да людзей, каб утварылі калідор — праход да помніка, якому было вырашана ўскласьці "дары ГУЛАГа" (шыбеніцы, кайданкі, ланцугі, зэкаўскую фуфайку, пудзіла энкавэдзіста і г.д. — усё, што прынёс Ленін і камунізм). Людзі расступіліся, і група ўскладальнікаў урачыста рушыла да помніка чорнага ідала. Узначальваць "шэсьце" павінны былі 4 дэпутаты. Заранёў я пра гэта ня ведала, але мяне паклікалі Сяргей Антончык і Валянцін Голубеў, і мы ўчацьвярох (разам з Галінай Сямдзянавай) рушылі як дэлегаты народа да шэрэнгаў міліцыі, якая перашкаджала ўскладальнікам "дароў" прайсьці да помніка. Нічога "страшнага" мы рабіць не зьбіраліся — толькі зьдзейсьніць сымвалічны акт (аддаць даніну іхняму Леніну тымі сымвалічнымі рэчамі, якія ўвасаблялі камуністычны рэжым, і ўскласьці іх да падножжа статуі). Але гэтая сымволіка так напужала камуністаў, што міліцыі быў дадзены загад спачатку не пускаць людзей, а потым — зрабіць сутычку. Людзі гэта зразумелі і сілай натоўпа разарвалі міліцэйскі лянцуг. Сымвалічная акцыя была зьдзейснена. Міліцыя спрабавала адціснуць людзей, "рассекчы", але на зьбіцьцё не адважылася.

Мы ж, Народны Фронт, сваю задачу выканалі. Гэта сталася кропкай адліку агоніі камунізма ў Беларусі.

Літаральна на наступны дзень пачаўся шквал паклёпу на Народны Фронт. Радыё, тэлебачаньне, газэты — усе хорам раўлі пра "экстрэмістаў" і "фашыстаў" БНФ. Атака была масаваная (але для бальшыні фронтаўцаў ня страшная), якая моцна перапужала, аднак, тых, хто ня быў сапраўдным адраджэнцам, а стаўся толькі спадарожнікам Адраджэньня да першага выпрабаваньня, пакуль "усё было ціха". Як толькі іхнаму ўласнаму камфорту нешта перашкодзіла, яны тут жа адмовіліся і ад Фронту, і ад Адраджэньня, і тым больш — ад змаганьня. Гэтыя людзі (у асноўным камуністы-перабудоўшчыкі, розныя савецкія пісьменьнікі і т. п.) пасыпаліся з Фронту, як асеньняе лісьце на дол пад парывам моцнага ветру. Пад шалёнай атакай камуністычных уладаў, партыйных ворганаў, друку, радыётэлебачаньня і функцыянераў (атака сапраўды была жудаснай, масаванай, усеабдымнай, з дня ў дзень), пад гэтай атакай ачысьціўся і загартаваўся Народны Фронт. Было цяжка, але вышла на добра. Барацьба патрабавала барацьбітоў, а не балбатуноў, пустапарожніх разумнікаў і назіральнікаў.

1991 г. Пікет у абарону В.Сядова. Гаворыць Галіна Пазьняк, справа — Валянцін Асташынскі.

ВЫЗВАЛЕНЬНЕ ВАЛЕРЫ СЯДОВА

Адным з актыўных ускладальнікаў "дароў" Леніну быў Валеры Сядоў. Ён спрабаваў закінуць вісельню на шыю стваральніка камуністычнага ГУЛАГа Леніна. Гэта ўсё было зьнята на плёнку, і В.Сядова арыштавалі.

Камуністы ў бяссільлі аж вар'яцелі. Акцыя была дазволеная, заяўнікі — дэпутаты. І як тут ім расправіцца з намі? Вырашылі адыграцца на В.Сядове, як кажуць, на ўсю катушку. Пазьняй Валеры расказваў, што ў Пішчалаўскай турме яго кінулі ў карцар — цёмны маленькі халодны і глухі пакойчык, які не праветрываўся, дзе ў цемнаце можна было толькі стаяць ці, скурчыўшыся, сядзець. Холад, голад, цемра і адзінота. У такой сітуацыі ня цяжка было страціць ня толькі здароўе, а нават і жыцьцё. У Валерыя, які перад гэтым аб'явіў галадоўку, — пачаліся галюцынацыі. Але Фронт адразу ж пачаў барацьбу за вызваленьне Валеры Сядова.

Як дэпутат Вярхоўнага Савету Зянон Пазьняк наведаў турму, і ў суправаджэньні начальніка Пішчалаўскай турмы абышоў увесь Пішчалаўскі замак зь верху да нізу, зазіраючы ў камэры, што стала штуршком для ягоных выкрывальных выступаў бесчалавечнага рэжыму на сэсіі Вярхоўнага Савета, і ў СМІ. Пазьняк зрабіў шмат дэпутацкіх запытаў пра арышт Сядова, хадзіў у пракуратуру, дамогся асабістага кантролю за гэтай справай ад пракурора па нагляду за выкананьнем законаў у турмах. Нарэшце ён пастараўся, каб справа Сядова выйшла за межы Беларусі і стала вядомая ва ўсім сьвеце. Неўзабаве нават беларусы ў Аўстраліі дэманстравалі з лёзунгам "Свабоду Сядову!". Вызваліць Сядова была справай нашага гонару.

Але камуністы здаліся не адразу. Таму і мы, фронтаўцы, вырашылі рабіць пікеты ў абарону Сядова. Цкаваньне Фронту было тады вельмі моцнае, што неяк насьцярожыла некаторых нашых дэпутатаў. Таму ўзначальваць пікеты павінны былі абавязкова дэпутаты.

Разам з сябрамі мы ня раз станавіліся на праспэкце (тады Леніна) недалёка ад кінатэатра "Цэнтральны" (каля крамы адзежы). Паколькі я была абаронена дэпутацкім імунітэтам, то прамаўляць трэба было менавіта мне. Побач стаялі сябры і спачуваючыя. Заўсёды адкрыта дэманстраваў сваю салідарнасьць з фронтаўскім вязьнем Валянцін Асташынскі (ён ня быў дэпутатам, і яго, разабраўшыся, маглі б "загрэбсьці"). Валянцін, як правіла, трымаў мегафон і стаяў побач, пакуль я гаварыла ў мікрафон. Пікет мы рабілі перасоўны, у розных "кропках" дзень за днём аж да таго часу, пакуль супольнымі намаганьнямі Фронту, дэпутатаў і ўсіх людзей добрай волі ўсе разам не дамагліся вызваленьня Валеры Сядова.

Як толькі В.Сядоў апынуўся дома, па даручэньні Старшыні Фронту мы з сябрамі адвезьлі яму фронтаўскую дапамогу (што сабралі сярод фронтаўцаў) і перадалі нашую маральную падтрымку і пажаданьне хутчэй паправіць сваё здароўе пасьля Пішчалаўскіх засьценкаў.

"ЛІТАРАТУРАЗНАЎЦА" З ПРАКУРАТУРЫ

Пасьля 7 лістапада 1990 г. Пракуратура ўзбудзіла справу. Па чарзе выклікалі ўсіх заяўнікаў мітынгу на допыт. Мяне не чапалі зь месяц, і я ўжо падумала, што "абышлі". Але неўзабаве прыйшла позва і да мяне.

Я прыйшла ў Пракуратуру каля 10 гадзінаў раніцы. Мяне сустрэў даволі самаўпэўнены сьледчы, вырашыўшы, відаць, што гэтай "дамачцы" ён крылы хутка абламае.

— Я буду вам задавать вопросы, а вы — отвечать, — начальніцкім тонам вымавіў сьледчы, гледзячы мне ў вочы. — Все ваши показания я буду записывать, а вы потом их подпишите.

— Добра, — кажу, — толькі папрашу задаваць пытаньні і "записывать" мае адказы на дзяржаўнай беларускай мове, згодна з Законам аб мовах.

— К сожалению, я не владею белорусским языком, будем говорить на русском, — усьміхнуўся ў адказ сьледчы.

— Калі вы ведаеце Закон, як дзяржаўны служачы вы абавязаны валодаць дзяржаўнай мовай, тым больш што я не разумею па-рускі. І як жа мы будзем з вамі гаварыць? І што, я павінна буду падпісваць тое, чаго не разумею? — адпарывала я крыху зьдзіклева на яго загадны (як да "вінаватай") тон. — Калі вы ня ў стане выконваць свае прафэсійныя абавязкі на дзяржаўнай мове, паклічце перакладчыка.

Сьледчы стаў злавацца, але запярэчыць мне не было аргумантаў, і ён моўчкі пайшоў шукаць перакладчыка. Яго не было хвілін 20. Вярнуўся ён ужо зусім "іншым" (магчыма, дзе-небудзь параіўся), пачаў прасіць прабачэньня, што не знайшоў перакладчыка. Ён пачаў лагодна і "по-хорошему":

— Извините, пожалуйста, но сегодня найти переводчика невозможно. Если хотите, перенесем нашу встречу на другой день. Но я все же просил бы вас согласиться на разговор сегодня.

— Добра, — кажу, — задавайце свае пытаньні, бо і ў мяне няма жаданьня губляць яшчэ адзін дзень. А як з запісам размовы? Я па-руску не пішу!

— Галина Федоровна, — узмаліўся сьледчы, — пожалуйста, согласитесь писать показания сами, ну нет другого выхода сегодня.

— Добра, — кажу, — толькі гэта ўсё пацягне часу. Задавайце свае пытаньні.

Сьледчы пачаў пытацца і пісьмова пісаць мне пытаньне (па-руску). Я адказвала вусна, а потым запісвала свае словы па-беларуску. Мы гаварылі пра падзеі 7 лістапада, што, як, калі адбывалася, пра мой удзел. Не абышлося без пытаньняў пра Фронт, пра яго "слабыя" сілы.

— Вы памыляецеся, у нас у Фронце самыя лепшыя і магутныя сілы Беларусі і самыя славутыя імёны, — адказваю.

Слова за слова, і неяк сьледчы зачапіў імя Васіля Уладзімеравіча Быкава.

— Послушайте, он же уже "исписался", и пишет... он обычный "публицист", а "не художник слова" і г д.

На гэты час я якраз займалася творчасьцю В.У.Быкава ў НДІ педагогікі (дзе працавала) і ўчапілася за "нехудожественные" творы.

— Вы так лічыце? Але вы памыляецеся, і зараз я вам гэта патлумачу як спэцыяліст. Слухайце.

Сьледчы паспрабаваў мяне лагодна перабіць ("Оставим это"), але тут ужо перабіла я.

— Вы закранулі мой нацыянальны гонар, абразіўшы вялікага сусьветнага пісьменьніка, відаць, памылкова лічыце гэта ў межах сваёй кампэтэнцыі. Што ж, давайце падыскутуем. Ня хочаце? Тады слухайце, каб больш ніколі ў вас не ўзьнікала жаданьня абражаць вялікага чалавека і мастака.

І я пачала чытаць яму лекцыю (хутка і ўпэўнена), са шматлікімі спасылкамі на творы мастака. Асабліва зловалі майго "слухача" (па вядомых прычынах) спасылкі на аповесьць "Мёртвым не баліць". Я гаварыла даволі доўга, сьледчы спрабаваў мяне перапыніць, але я перакананая йшла "ў атаку", і сьледчы пракурор зьмірыўся і слухаў. І толькі калі падышоў час абеду, ён запэўніў, што згодны са мной, што зразумеў мяне як прафэсіянала-філолага.

— Сейчас время обеда, я предлагаю спуститься в наш буфет, — пачула я прапанову.

— Я прыйшла да вас не на абед, а на ваш "допыт", вось і дапытвайце, — так "прымусіла" я сьледчага "пагаладаць".

Гаварылі мы шмат, аж да 19-й гадзіны (бо ўсё трэба было зафіксаваць). Я падкрэсьлівала, што зьяўляюся антыкамуністам і ганаруся нашай акцыяй 7 лістапада. Сьледчы не пераставаў зьдзіўляцца:

— Галина Фёдоровна, вы не боитесь? А что, если времена изменятся и всё вернется назад?

— Не, не баюся, — адказала я, і гэта была абсалютная праўда. — Як бы ня сталася, але я выбрала свой шлях сьведама, і сьведама стала антыкамуністам. Няхай баяцца тыя, хто здзяйсьняў антычалавечую палітыку і зьнішчаў беларускі народ. А я — звычайная беларуска, люблю Беларусь і не хачу, каб яна была пад акупацыяй Расеі. Што ў гэтым антынароднага, дрэннага?

Размова завершана не была, але болей я дыскутаваць не зьбіралася.

— Ужо 19 гадзінаў, працоўны дзень скончаны. Я сьпяшаюся на вечарыну нашага адраджэнскага барда Сокалава-Воюша. Калі маеце яшчэ пытаньні — другім разам, — і я рашуча ўстала. Так скончыўся мой "допыт" ў Менскай Пракуратуры.

Магчыма, зараз гэта выглядае і непраўдападобна, але так было. Сістэма дагнівала, пачыналіся перамены, і ніхто з працаўнікоў сістэмы ўжо не адчуваў сябе ўпэўнена (трапіла б я яму ў 30-я). Калі яшчэ ўлічыць мой уздым і перакананасьць — і неагрэсіўнасьць сьледчага, дык у выніку атрымалася даволі сьмешна, нават камічна: сьледчы вымушана слухаў таго, каго сам выклікаў на допыт.

ПРАПАНОВА В.ЯКАВЕНКІ І С.МІХНОВА

Нягледзячы на маё дэпутацтва і занятасьць як сябра Сойму БНФ, я заставалася сябрам Койданаўскай Рады Фронту і ўдзельнічала ў яе паседжаньнях. Тады быў агульны энтузіязм, і на любы заклік Фронту мы, койданаўцы, адгукаліся першымі. Аднаго разу вясной С.Міхноў прывёў на паседжаньне Рады Васіля Якавенку. Ён жыў ня ў нашым раёне і тады ўжо ня быў сябрам Фронту (у 1989 годзе ён выступіў, здаецца, у "Советской Белоруссии" супроць дзеяньняў Фронту і яго выдалілі з БНФ па ідэйных меркаваньнях). Тым ня менш ён прыйшоў да нас з прапановай, каб мы ўсёй Радай узяліся за добраўпарадкаваньне Паўднёвага Захаду. Ён гаварыў, што мы будзем саджаць дрэвы, рабіць дарожкі, прыбіраць тэрыторыю, садзіць кветкі, і тады, маўляў, усе ўбачаць, што такое Фронт. "Каб людзі нам паверылі, мы павінны на справе пераканаць іх, што шчыра хочам перамяніць жыцьцё да лепшага", — энергічна гаварыў Якавенка.

Сябры слухалі. Адны скептычна, ведаючы прамоўцу, але бальшыня — з энтузіязмам і вочы іх сьвяціліся: такім вялікім было жаданьне пераменаў. Было відаць, што ўсе згодныя працаваць, тым больш што Якавенка браўся забясьпечыць саджанцамі і ўсім неабходным інструмантам. Сталі абмяркоўваць першую акцыю.

"Толькі давайце будзем мудрэйшымі і сьціплейшымі. Ня трэба падкрэсьліваць, што мы — Фронт, ня трэба сьцягоў. Давайце працаваць, а людзі самі ва ўсім разьбяруцца", — угаворваў нас Якавенка.

Міхноў маўчаў. Тады я ня вытрымала: "Як гэта без сьцягоў? Мы — гэта Фронт, і мы ўсюды і заўсёды павінны падкрэсьліваць гэта. Толькі са сьцягам і толькі як Беларускі Народны Фронт! І ніякіх спэкуляцыяў не павінна быць. Чаго нам хаваць наш сьцяг?"

Сябры падтрымалі мяне, і мы разам пагадзіліся, што будзем працаваць толькі зь Бел-Чырвона-Белым Сьцягам і пад эгідай Фронту. Якавенка спрабаваў спрачацца, даказваць, але ўбачыў, што гэта ня мае сэнсу. "У такім разе я не зьбіраюся прадстаўляць вам ніякія інструманты і саджанцы", — амаль выкрыкнуў Якавенка і, абураны, "ляснуў дзьвярыма". Ён пайшоў, і ўсе пераканаліся, што гэта была звычайная правакацыя.

Прайшоў нейкі час. Аднаго разу Сяргей Міхноў патэлефанаваў мне дадому і сказаў, што трэба тэрмінова пагаварыць. Я запрасіла яго ў хату, але ён цьвёрда сказаў: "Выйдзем на вуліцу — сур'ёзная размова".

Мы хадзілі па вуліцах майго раёна, і Сяргей спачатку доўга нешта тлумачыў мне пра нашае змаганьне, пра Фронт. Я слухала.

— Ты актыўны і сумленны чалавек (кампліментарна казаў Сяргей), шмат працуеш у Фронце, але, я думаю, не ва ўсім разьбіраешся добра і да канца. Ты надта верыш у непагрэшнасьць Пазьняка, а між тым ён не такі ўжо і "правільны", як ты думаеш. Ёсьць людзі, якія думаюць інакш... — на правах сябра казаў мне Сяргей, і ўвесь пафас яго "прамовы" зводзіўся да таго, што "Фронт" і "Пазьняк" зусім не адно. Ён вельмі стараўся пераканаць мяне, прасіў падумаць, прыводзіў нейкія свае "аргуманты" "кепскасьці" Пазьняка, каб я засумнявалася не ў Фронце ці ў нашай барацьбе, а менавіта ў старшыні Фронту. "Ты не падумай, я ня супраць Пазьняка, я "за", але ці варта ўжо так старацца, як ты, менавіта для яго "іміджу", як быццам акрамя яго ў нас ужо больш і лідэраў няма, падумай", — скончыў Сяргей.

Я была ашаломленая і ад чыста жаночай разгубленасьці не з'арыентавалася ў сітуацыі, каб адпаведна адказаць. Ды і аргумантаў у мяне было няшмат. Упершыню я ўбачыла і даведалася пра Пазьняка нядаўна, у канцы 1988 года. Слухала ягоныя выступы-прамовы як шараговы сябра Фронту — вось і ўсе "веды" "здаля". Сяргей жа быў сябра, і мой, і Фронту, і ўсе мы (у тым ліку і я) неяк прывыклі яму давяраць і верыць. Але я не магла ня верыць і сваім вушам, якія слухалі Пазьняка і "бачылі" ягоную праўду. Гэтая "праўда" стала і маёй, таму я хоць і "змаўчала", але пераканаць мяне ў адваротным (у тым, што Пазьняк не сапраўдны лідар, які ахвяруе ўсё сваё жыцьцё дзеля Бацькаўшчыны, што ён не бачыць значна далей за іншых "лідараў" і не заўсёды гаворыць праўду) — было немагчыма. Я падумала, што, можа, Сяргей памыляецца, што гэта "пройдзе", бо мы ж усе любім адно — нашую Беларусь.

Потым Сяргей ніколі больш не аднаўляў гэтую нашу размову. Чаму? Ня ведаю, магчыма, зразумеў, што для мяне ў рэшце рэшт справа была не "ў Пазьняку" (хоць ён для мяне заўсёды заставаўся самым вялікім аўтарытэтам), а ў нашай Бацькаўшчыне. Я бачыла шчырую любоў Пазьняка да Беларусі і адгукалася на яе, бо люблю Бацькаўшчыну гэтаксама — усім сэрцам). Калі любіш Беларусь — ніхто не саб'е і не "перавучыць", бо крытэрый — адзін: Беларусь.

АПАЗЫЦЫЯ БНФ І ЛЁС БЕЛАРУСІ

Бясспрэчна, лёс Беларусі, яе будучыня вырашаліся ў Вярхоўным Савеце. І тут было вельмі важна, якая колькасьць ад агульнага складу дэпутатаў належыць прадстаўнікам Беларускага Народнага Фронту. На жаль, іх у Вярхоўным Савеце 12-га скліканьня аказалася вельмі мала: Апазыцыя БНФ склала менш 10 працэнтаў. І не перастаеш зьдзіўляцца, як многа зроблена гэтымі людзьмі, як бліскуча яны перамагалі халуёў страшнай таталітарнай сістэмы. Гэтыя людзі навечна ўвайшлі ў гісторыю нашай Бацькаўшчыны як герої-змагары за яе Свабоду. Іхнае жыцьцё гэтыя пяць год было падпарадкаванае змаганьню. Яны не шкадавалі сілаў. Гэта было цалкам ахвярнае жыцьцё.

Раніца 12 красавіка 1995 года ніколі не сатрэцца з маёй памяці. Тады, скарыстаўшы ўсе магчымасьці парляманцкай барацьбы, каб ратаваць Бацькаўшчыну, дэпутаты Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце 12-га скліканьня пайшлі на надзвычай мужны ўчынак — аб'яўленьне галадоўкі ў залі каля трыбуны парляманту ў знак пратэсту супраць грубага парушэньня Канстытуцыі Лукашэнкам і пракамуністычным парлямантам, падрыхтоўкі антызаконнага рэфэрэндуму і здачы дзяржаўных інтарэсаў. Сваёй нечаканай галадоўкай яны паўплывалі на вынікі парляманцкага галасаваньня і перамаглі. Дэпутаты не прагаласавалі за антынацыянальныя пытаньні рэфэрэндуму. Але ноччу Лукашэнка ўвёў у парлямант войскі. Дэпутаты Фронту былі зьбітыя і вывезены з парляманту. Пытаньні рэфэрэндуму пад пагрозай вайсковай сілы былі незаконна перагаласаваныя і перазацьверджаныя з парушэньнем закону.

Пра гэта мала гаварыць "у агульных рысах", гэта прадмет спэцыяльнага дасьледаваньня. Мяркую, яно будзе зроблена нашымі гісторыкамі, палітыкамі, вучонымі, пісьменьнікамі. І вельмі важна, каб гэта адбылося хутчэй, пакуль ня сьцерлася з памяці ніводная дэталь дзейнасьці парляманцкай Апазыцыі Народнага Фронту ў Вярхоўным Савеце 12-га скліканьня, бо кожны іх дзень жыцьця быў унікальны.

(Працяг будзе.)

Антыкамуністычны мітынг БНФ 7.XI.1990. (Справа — Валеры Сядоў).

Народная Воля http://www.nv-online.info
31 СТУДЗЕНЯ 2008 г.

ЧУЛІ?

Зміцер Вайцюшкевіч заспяваў па-японску

Там вядомы беларускі музыкант дасць некалькі канцэртаў.

"Гэта не камерцыйныя канцэрты, — гаворыць Вайцюшкевіч. — Я буду выконваць японскія песні на беларускай мове. Падрыхтоўка да гэтага праекта ішла даволі доўга. Мне гэта вельмі цікава. Да таго ж акампаніраваць мне будуць японскія "Dreydel". Таксама спяю адну кампазіцыю на японскай мове — гэта будзе песня пра маці".

«Рамантычны канцэрт ад "Крамбамбулі»

14 лютага, у сусветны Дзень усіх закаханых, гурт "Крамбамбуля" запрашае на "Рамантычны канцэрт", які адбудзецца ў мінскім West World Club. У праграме новыя песні і лепшыя хіты, а таксама галоўнае — прыемныя сюрпрызы і неабмежаваны святочны настрой!

"Спецыяльна для гэтага канцэрта мы рыхтуем розныя нечаканыя дуэты, — распавядае **Лявон Вольскі**. — Гэта свята закаханых, таму будзе шмат рамантычных песень, якія мы будзем спяваць разам з вядомымі дзяўчынкамі".

Плануецца, што з "Крамбамбуляй" у гэты дзень заспяваюць прадстаўніцы розных мастацкіх і музычных плыняў: актрысы **Святлана Зелянкоўская** і **Ганна Хітрык** ("ДетиДетей"), рок-вакалісткі **Руся** (Indiga) і **Вольга Самусік** ("Тарпач", Zygimont Vaza), фолк-спявачка **Маша Яр** (Yar). Таксама падчас гэтага канцэрта ўпершыню за 4 гады гурт выканае песню "Грапа, к'янці і марціні" разам з опернай спявачкай Нінай Цішко.

"Гэта без перабольшванняў ужо легендарны дуэт. Трэба будзе яго неяк запісаць!" — лічыць Лявон Вольскі.

Квіткі каштуюць **25 тыс.** (танцпол), **50 тыс.** (столік).

Валентинка от Искуи

13 февраля во Дворце Республики певица Искуи Абалян устраивает праздничный концерт по случаю Дня святого Валентина.

В концерте принимают участие Ядвига Поплавская и Александр Тиханович, Алексей Хлестов, Александр Патлис, Лариса Грибалева, Инна Афанасьева, Петр Елфимов, Виктор Пшеничный, Ольга Плотникова, Анна Шаркунова, Полина Смолова, Гюнешь, "Харли", "Да Винчи" и многие другие.

ПРЕЗЕНТАЦИЯ

Можно ли на 105 тысяч белорусских рублей купить корову?

На днях народный артист Беларуси, солист Национального академического большого театра оперы Владимир Петров презентовал свой первый сольный диск "Средь шумного бала…".

Это дебютный диск из новой серии "Лучшие голоса страны".



О выгоде

— Сразу хочу сказать, что это не коммерческий проект, — *говорит Владимир Петров.* — У меня не было задачи получить от издания этого диска какую-то выгоду. Скорее, это душевная потребность. По Белорусскому телевидению, конечно, идут хорошие передачи, но там в основном акцент сделан на эстраду. Хотя из своего концертного опыта могу сказать, что жанр романса очень востребован. Романсы, собранные на диске, я часто исполняю на своих концертах. В определенном смысле они давно стали шлягерами...

О классике

— К сожалению, ниша классической музыки сегодня незаслуженно не заполнена, — *констатирует факт артист.* — И у нас к классике относятся не так трепетно, как на Западе. Например, в Германии во время спектакля под открытым небом публика не расходится, даже если он прерывается из-за проливного дождя. Публика сидит и ждет продолжения. Там есть потребность в красивой музыке, чем мы пока, к сожалению, похвастаться не можем. Хотя, наверное, по тому, насколько востребована классическая музыка, можно судить о культуре нации.

О спонсорах

— Я благодарен инициатору создания этого диска Евгению (фамилию таинственного спонсора артист Петров называть почему-то не захотел) — благодаря ему и компании "Вест Рекордс" этот диск вышел в продажу, — *говорит известный баритон.*

— Кто финансирует проект "Лучшие голоса страны"? Просто появилась заинтересованность компании, отпечатали пробные 500 дисков. От того, как они будут продаваться, зависит дальнейшая судьба проекта. Если диски раскупят, то не исключено, что в будущем под этой же серией выйдет сборник белорусских авторов.

О проблемах

— Сегодня в опере немало проблем, — *говорит Петров.* — Понятно, что этот жанр не окупается. На реконструкцию здания Театра оперы и балета затрачены большие деньги, поэтому пока мы лишены возможности ставить какие-то оперы. Спектаклей у нас сейчас идет в два раза меньше. Но, как говорится, нет худа без добра: мы стали больше ездить по стране, ставим малые формы.

Опера многих держит на расстоянии, потому что некоторые произведения исполняются на иностранном языке. В новом здании нам обещают бегущую строку. Мы с нетерпением ждем, когда театр отреставрируют. Но понятно, что театр — не только здание. За эти годы мы теряем публику. И чтобы ее сохранить, мы должны постоянно заявлять о себе...

В ТЕМУ

Немелочный вопрос

По словам некоторых оперных артистов, в свое время солисты Императорского театра получали 1000 рублей серебром.

Солисту Его Императорского Величества великому басу Федору Шаляпину платили 1000 рублей золотом.

Корова в те времена стоила три рубля.

Владимир Петров стал народным артистом в 2006 году. Он говорит, что сегодня за звание "оперного генерала" получает примерно 105 тысяч белорусских рублей.

Вопрос риторический: можно ли на эти деньги сейчас купить корову?

Кстати, сам Владимир Петров не стал рассуждать на тему невысоких зарплат. Заметил только, что *"денег всегда не хватает..."*.

Марина КОКТЫШ.

БЛІЦ

А калі вы апошні раз былі ў оперы?

Віктар БАКА, мастак:

— Цікава атрымліваецца — сёння вы патэлефанавалі мне з гэтым пытаннем, а толькі ўчора я запрашаў сваю дзяўчыну ў оперу! Праўда, яна пакуль яшчэ думае: згаджацца або не на маю прапанову. Я даўно не быў у оперы ў сілу сталай занятасці. Заўсёды нешта перашкаджае мне схадзіць і паслухаць жывую музыку. І гэта нягледзячы на тое, што жыву практычна побач з Нацыянальным акадэмічным тэатрам оперы. Я творчы чалавек. Жывая музыка мне вельмі дапамагае настроіцца на працоўны лад, надае веліч і натхненне. Мне падаецца, што той жа тэатр, не гаворачы ўжо аб кінатэатры, саступае оперы. Не разумею тых людзей, якія не любяць гэты від мастацтва...

Таццяна КУБЛІЦКАЯ, аніматар:

— Вельмі даўно была ў оперы. Яшчэ да таго моманту, калі тэатр падзяліўся... Пасля гэтага неяк не ўспрымаю яго як адзінае цэлае. Ведаеце, і не было асаблівага жадання схадзіць у оперу. Нават не ведаю чаму. Думаю, што ёсць добрыя пастаноўкі, але неяк атрымалася, што я аб іх нічога не чула. Можа, няма годнай рэкламы. Мне падаецца, што добрыя спектаклі трэба рэкламаваць. Глядач павінен ведаць пра іх.

Юрый ІВАНОЎ, фатограф:

— Летась быў на адным прэм'ерным спектаклі. Мне вельмі спадабалася. Адзінае, што выклікала абурэнне, гэта тое, што спектакль праходзіў у Доме афіцэраў, што не вельмі зручна — там не ўсё прыстасавана да пастановак. А так хаджу ў оперу па меры таго, як запрашаюць. Я ж фатограф. Не толькі атрымліваю асалоду ад музыкі, але яшчэ і фатаграфую, каб уся гэтая прыгажосць засталася на доўгую памяць. А наогул, музыка вельмі моцна дапамагае ў працы, расслабляе, настройвае на патрэбны лад, узнімае настрой. Па сабе зазначыў, што нашмат прыемней і цікавей працаваць пад музычнае суправаджэнне.

Вольга БАРАНЧУК, студэнтка:

— Я ні разу не была ў оперы. Але столькі чула аб гэтым відзе мастацтва. Зараз не магу сабе дазволіць схадзіць у оперу. То вучоба замінае, то матэрыяльнае становішча. Бо недарма гавораць, што опера — гэта самы дарагі від мастацтва. А для студэнта гэта асабліва адчувальна... Хоць у мяне музычная адукацыя і я проста люблю слухаць жывое выкананне. Думаю, што с цягам часу мне ўсё ж такі давядзецца трапіць у тэатр оперы.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ, старшыня камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў:

— Па праўдзе, у оперы быў даўно. Гады два, пэўна, таму... Зараз проста часу няма, шмат бягучых спраў... Пішу дысертацыю, працую над заканадаўствам, нядаўна дачку выдаў замуж. Я вельмі люблю слухаць класічную музыку. Прыемна часам чуць яе па радыё або тэлевізары.

Аляксандр САСНОЎ, экс-міністр працы:

— Вельмі даўно. Справа ў тым, што я не вялікі аматар оперы. Мне больш падабаецца балет.

Ніна ГУЛЯШОВА, інтэграцыйны ўрач:

— Не магу ўспомніць дакладна калі, але ведаю, што вельмі даўно. Гэта хутчэй за ўсё ў сілу маёй занятасці. Я вельмі люблю мастацтва: оперу, балет, тэатр... Але пакуль не атрымліваецца наведваць гэтыя ўстановы так часта, як хацелася б. Але думаю, што крыху пазней, калі ў мяне стане нашмат больш вольнага часу, буду часцей хадзіць у тую ж оперу. Бо без мастацтва нельга жыць. Я паўгода назад схадзіла на балет, а эмоцый і ўражанняў хапіла на доўгі час. Так падняўся настрой, што хацелася проста лятаць!

Дзмітрый БАБРОЎСКІ.

НАРОДНАЯ ДУМКА

Ці павінен "Севільскі цырульнік" быць беларускім?

У адным з мінулых нумароў "Народная воля" праанансавала адну з бліжэйшых прэм'ер Опернага тэатра — казачную оперу М.Рымскага-Корсакава "Кашчэй Бессмяротны". Некаторыя наведвальнікі нашага сайта nv-online.info літаральна ўзбунтаваліся.

Так, нехта "Мірон" напісаў:

"Не спрачаюся, Рымскі-Корсакаў — цудоўны кампазітар. Але ж, спадары пастаноўшчыкі і выканаўцы, вам навешваюць рускі рэпертуар дзеля таго, каб вы, беларусы, хутчэй сталі рускімі, для таго, каб рынізіць беларускую культуру і беларускі народ, які стварыў гэтую культуру. Вашы рускія оперы — гэта ганьба для беларусаў! Няўжо няма Цікоцкага, Багатырова, Туранкова, Глебава і іншых? Сваімі рускімі операмі і балетамі вы дыскрэдытуеце і аплёўваеце беларускую культуру і саміх сябе. Няўжо ў вас няма асабістага гонару? Аляксандр Краснадубскі, у вашай радні ёсць людзі, якія змагаліся за беларускую мову. Няўжо вы не ведаеце?"

"Паважаны Мірон! — уступіў у дыскусію наведвальнік сайта **"Г-й"**. — Не паглыбляючыся ў абмеркаванне вартасцяў той ці іншай пастаноўкі, дазвольце запытацца: а калі б, напрыклад, гаворка ішла аб "Рамэа і Джульеце", "Севільскім цырульніку" або "Вестсайдскай гісторыі" — ваша рэакцыя была б аналагічнай?"

"Мирон, ты не прав, — выказвае свой пункт гледжання аўтар **mik**. — Было бы большой ошибкой вариться только в собственном соку".

"Вообще-то я поражена узостью интересов Мирона, — говорит **Анна Васильева**. — Я не знаю ни одного белорусского композитора (не в обиду им будет сказано), у которых была бы такая гениальная музыка, как в операх Чайковского, Беллини, Россини, Верди. Это музыка дает такую энергию, такую жажду жизни, что ни один белорусский композитор еще не создал такой музыки. Надо обогащаться мировой культурой. И то, что ставят русские оперы — это просто прекрасно. Если бы еще и исполнители были мирового уровня в белорусских операх (я имею в виду гастроли), это было бы просто счастье! Не тупи, Мирон!"

А што думаеце на гэты конт вы, паважаныя чытачы?

Аліна ВЕТРАВА.

НОВЫЕ ИМЕНА

Екатерина ЛИПОВСКАЯ: «Многие не понимают, почему наградили именно нас»

В минувшем году, приехав в Минск на III Международный фестиваль "Панорама", народный артист России, худрук МХТ им А.Чехова Олег Табаков наградил стипендиями студентов театрального факультета Белорусской государственной академии искусств — Екатерину Липовскую и Максима Брагинца.

О том, что изменилось в их жизни с тех пор, "Народная воля" расспросила молодую актрису Екатерину Липовскую.

"Лично я не почувствовала, что после этого события отношение к нам улучшилось, — говорит Екатерина. — *Многие из тех, кто с нами учится, не понимают, почему наградили именно нас, и считают себя лучше нас, талантливее и, соответственно, более достойными этой награды. Поздравляли только близкие и педагоги, которые были очень рады за нас".*

Сразу после вручения стипендии в околотеатральных кругах говорили о том, что теперь молодые белорусские артисты наверняка эмигрируют в Москву — в театр к Табакову. Однако Екатерина эти слухи опровергла.

"Нас никто никуда не звал, — говорит она. — *Мы общались с Олегом Табаковым только на сцене — во время награждения. Он нас с Максимом даже не знает. Табаков просто проявил инициативу помочь материально некоторым студентам, но сам никого не выбирал. "Лучших" выбирала Академия, приурочившая награждение к приезду мэтра. Причем мы до последнего ничего об этом не знали. Нам сказали, что будет сюрприз. Только*

когда нас вызвали на сцену и вручили конверты, мы поняли, что это денежное награждение".

Кстати, на "табаковскую стипендию" номинировались еще двое студентов — Лана Анцаридзе и Дмитрий Гриневич. С ними Екатерина и Максим решили разделить деньги. В итоге каждый получил по полтора миллиона белорусских рублей.

"Вначале сказали подняться на сцену всем четверым, а потом уже перед выходом нам сказали, что пойдем только Максим и я, — объяснила Екатерина. — *Поэтому, когда мы получили награждение, мы поделились со всеми".*

По какому принципу выбирались самые лучшие студенты, сами награжденные не знают.

"В Академии искусств был приказ выбрать четверых лучших студентов, — говорит Катя. — *Потом я прочитала в интернете, что наградили якобы самых талантливых и самых бедных студентов. Мы даже ходили в деканат узнавать, что это значит... Но мы не самые бедные, мы — такие же студенты, как и все! Что касается самых талантливых, то это не нам решать".*

Денежные поощрения, по словам Екатерины, в студенческой жизни случаются очень редко.

"В основном, если хотят поощрить, то просто делают надбавку к стипендии, — говорит она. — *Но это не только финансовая поддержка. Награждение придало уверенности в себе. И наложило определенную ответственность. Раз тебя выдвигают в качестве такой кандидатуры, значит, на тебя делают определенную ставку. Вот и приходится, как сказал Станиславский, работать, работать и еще раз работать".*

Ольга ПРУДНИКОВА.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Руслан АЛЕХНО:

«Разговаривают по-белорусски только бабушки и дедушки в деревнях»

"Знаю, что в этом году на "Евровидении" Беларусь будет представлять артист Руслан Алехно. Хотелось бы знать, чем он знаменит, что говорит о своей стране в Москве — если не ошибаюсь, он в последнее время там живет…"

Иван МЕДВЕДЕВСКИХ, Минская область.

Пожалуй, одно из самых ярких интервью несколько лет назад Руслан Алехно дал российской газете "Московский комсомолец".

Вот лишь несколько вопросов и ответов оттуда, которые мы оставляем без комментариев. Выводы, уважаемые читатели, делайте сами.

— **Зачем ты вообще поехал в Москву?**

— В Белоруссии невозможно сделать карьеру. На конкурсах мне выше второго места не давали. Лишь в 2002 году я взял Гран-при в конкурсе "Виват победе!". Мне сразу говорили продюсеры: пойдешь работать к нам — будет первое место. Как себя вести на сцене, как одеваться — этому там не учили. И продюсера, который бы писал тебе песни или вкладывал деньги в их написание, тоже не было.

А Россия — огромная страна, и я считаю, что только в Москве себя можно раскрутить и реализовать как певца.

— **В бывших союзных республиках сейчас очень трепетно относятся к национальному языку. Тебе в Белоруссии не высказывали претензии, что ты поешь по-русски?**

— Да, я записал альбом на русском. Но у нас же не такая ситуация, как в Украине. В Белоруссии разговаривают по-белорусски только бабушки и дедушки в деревнях. А в городе — так вообще никто на нем не говорит...

В ТЕМУ

Ольга ЗИНОВАЯ, директор белорусской певицы Гюнешь АБАСОВОЙ: «Мы в состоянии поспорить не только с Москвой!»

Во время онлайн-конференции с Гюнешь Абасовой на сайте kp.belkp.by ее директор сделала ряд справедливых замечаний.

"Проходит отборочный тур "Евровидения" в Беларуси, — говорит Ольга. — В качестве почетных гостей — Фридлянд и Брейтбург. Мне, гражданке Беларуси, эти имена ни о чем ни говорят. Есть более авторитетные люди, которые могли бы почтить своим присутствием это мероприятие. Понимающие не хуже московских "шоуменов".

Во время представления Руслана Алехно ведущий "Евро-Феста" объявил: "Сейчас будет выступать певец, который в свое время пообещал: я буду народным! И он стал народным!" Для меня лично это прозвучало как оскорбление всех тех, кто получил звание народных артистов, заработанное на протяжении всей жизни.

Много звучало со стороны организаторов: мол, Москва умеет и может все. В команде у Гюнешь работали профессионалы. И они тоже работают в Москве! Да и не только в Москве! Просто живут здесь, в Беларуси. Но мы в состоянии поспорить не только Москвой!

Нужно правильно подбирать и ценить своих!

Мы так много говорим о том, что из Беларуси "вымываются" таланты. Это будет неизбежно продолжаться, если ситуация не изменится. Надо не бояться давать дорогу молодым. Пусть они даже ошибаются, но за ними будущее. В них необходимо воспитывать чувство национального самосознания и гордость за свою Родину. Не побоюсь таких высоких слов..."

Фото photo.bymedia.net

2 лютага — 170 год з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага (2.02.1838—22.03.1864)

«Не жаль загінуць за тваю праўду»

22 сакавіка 1864 года ад рук царскіх катаў загінуў нацыянальны герой Беларусі, правадыр нацыянальна-вызвольнага пўстання 1863—1864 гадоў, рэдактар і выдавец першай беларускай газеты "Мужыцкая праўда" Кастусь Каліноўскі. Ён быў павешаны ў Вільні на Лукішскай плошчы апрычнікамі маскоўскай дэспатыі.

Галоўнымі мэтамі Каліноўскага былі Воля і Незалежнасць нашай Бацькаўшчыны. Ён стаў адным з арганізатараў узброенага паўстання ў Беларусі і Літве. Мужна змагаючыся з расійскімі акупантамі, народны герой Кастусь Каліноўскі аддаў сваё маладое жыццё дзеля гэтых мэт.

Беларускае вызвольнае паўстанне Каліноўскага было задушана таму, што царская Расія кінула ў Беларусь вялізныя збройныя сілы пасля разгрому супраціву ў Чэчні, Дагестане, Чаркесіі і Абхазіі, дзе Расія вяла захопніцкую вайну каля 50 гадоў.

Кастусь Каліноўскі пражыў нядоўгае, але надзвычай яркае, плённае жыццё. Адзін зрабіў бадай больш, чым цэлае пакаленне людзей.

"Ён быў адным з самых інтэлігентных у той час мужоў, адукаваны, чысты, поўны дабрачыннасці, розуму і энергіі", — казаў пра Кастуся Каліноўскага ўдзельнік паўстання 1863 года, сябра варшаўскай рэвалюцыйнай арганізацыі Юзаф Яноўскі. У такога героя няма смерці.

Кастусь Каліноўскі

З "Лістоў з-пад шыбеніцы да беларускага люду"

...За ўсіх старон маскалі цяпер талкуюць нам без устанку а сваём брацтве з намі... Ня будзем гаварыці, з якіх народаў маскалі паўсталі, брацтва там ня многа найдзем, няволя манголаў да і цароў маскоўскіх заўсім забіла ў гэтым народзе ўсякую памяць а свабодзе...

...Пагляньма ж цяпер, што ён зараз пачаў рабіці, гэты дабрадзей мужыцкі, як сам цяпер кажа: найперш, каб не магло вырабляціся сумленне народнае, пакасаваў маскаль усе сходкі людзей выбарных, усе школы нашыя, а так, абабраўшы з сумлення да і з розуму, а завёўшы ў нас свой парадак маскоўскі, пазволіў кожнаму дужшаму глуміцца над бедным як толькі схоча...

* * *

Браты мае, мужыкі родныя! З-пад шыбеніцы маскоўскай прыходзіцца мне да вас пісаці, і можа раз астатні. Горка пакінуць зямельку родную і цябе, дарагі мой народзе. Грудзі застогнуць, забаліць сэрца, але не жаль загінуць за тваю праўду.

Прымі, народзе, на шчырасьці маё слова прадсьмертнае, бо яно як бы з таго сьвету толькі для дабра твайго напісана..."

Продкі Уладзіміра Высоцкага былі з Беларусі

На мінулым тыдні споўнілася 70 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага (1938—1980 гг.), знакамітага акцёра, паэта, выканаўцы ўласных песень. Але ні ў адной з юбілейных перадач не было сказана, што продкі Уладзіміра Сямёнавіча — з нашых краёў.

Паводле архіўных звестак, якія захоўваюцца ў Брэсцкім архіве, дзед артыста, таксама Уладзімір Высоцкі, доўгі час жыў у Брэст-Літоўску. Потым яго сям'я пераехала ў Кіеў, дзе нарадзіўся бацька Уладзіміра Высоцкага Сямён. Потым сям'я пераехала ў Маскву, і ўжо тут нарадзіўся Уладзімір Сямёнавіч Высоцкі.

ФОТАФАКТ

Акрамя "чорнага спісу" музыкантаў, у Беларусі, падобна, існуе і "чорны спіс" забароненых мастакоў. На афіцыйным узроўні, відаць, забаронена нагадваць пра творчае аб'яднанне "Пагоня".

У кнізе "Мікола Селяшчук. Гучанне музыкі нябёсаў" экс-кіраўніка "Пагоні", вядомага беларускага мастака Аляксея Марачкіна літаральна "выразалі" з фотаздымка.

Параўнайце гэтыя здымкі, і вы самі ва ўсім упэўніцеся.

На першым: 1992 год. На прыступках Акадэміі мастацтваў — Уладзімір Тоўсцік, Уладзімір Савіч, Мікола Селяшчук, Уладзімір Басалыга, Гаўрыла Вашчанка, Аляксей Марачкін, Леанід Шчамялёў, Уладзімір Зінкевіч. Намінанты прэміі "Чалавек года". Здымак быў надрукаваны 22 студзеня 1993 года ў газеце "Советская Белоруссия".

Другі здымак — з новай кнігі. На ім усё тыя ж. Толькі Аляксея Марачкіна ўжо няма.

ВАС ЦІКАВІЦЬ

Ці былі ў Беларусі дысідэнты?

Паважаная "Народная воля", добра вядома пра савецкіх дысідэнтаў часоў "развітога сацыялізму", але нешта я ніколі не чуў пра дысідэнтаў-беларусаў. Іх не было, ці пра іх проста мала вядома?

Генадзь Радзевіч, г.Калінкавічы.

Паводле звестак Міжнароднага гісторыка-асветнага, дабрачыннага і праваабарончага таварыства "Мемарыял", у 1961—1987 гадах па артыкуле 67 Крымінальнага кодэкса БССР за антысавецкую агітацыю і прапаганду судовымі органамі было асуджана 28 дысідэнтаў. Акрамя таго, 19 ураджэнцаў Беларусі, якія жылі на тэрыторыі іншых рэспублік СССР, былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці за антысавецкую агітацыю і прапаганду.

Сярод беларускіх дысідэнтаў гісторык Ігар Кузняцоў называе 21-гадовага мінскага студэнта Сяргея Ханжонкава, асуджанага ў 1963 годзе на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў узмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці за намер узарваць у Мінску па вуліцы Казлова антэны радыёперашкод для глушэння трансляцыі заходніх радыёстанцый. *"Ханжонкаў, які свядома хацеў знішчыць антэны глушылак, каб прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы парушэння ў Савецкім Саюзе права грамадзян на атрыманне поўнай і дакладнай інфармацыі, абвінавачваўся ў антысавецкай агітацыі і прапагандзе, удзеле ў дзейнасці антысавецкай арганізацыі і ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта",* — зазначыў І.Кузняцоў. Ён адбываў пакаранне ў вядомым мардоўскім лагеры, дзе ўтрымліваліся ўсе савецкія дысідэнты.

Дарэчы, Сяргей Ханжонкаў яшчэ жывы. І ў бліжэйшых нумарах "Народная воля" прапануе вам інтэрв'ю з гэтым незвычайным чалавекам.

Марат ГАРАВЫ.

ГАСТРОЛЬ

Земфира скажет «Спасибо»

20 февраля во Дворце спорта выступит одна из самых ярких исполнительниц на пространстве СНГ Земфира со своим новым альбомом "Спасибо".

Альбом "Спасибо" — это 12 абсолютно новых песен Земфиры.

"Этот альбом — отражение меня сегодняшней, — говорит Земфира. — Мне стукнуло 30, в результате некоторых внутренних бурь я многое поняла. Да, альбом очень позитивный! Если "Вендетта" была неспокойной, я что-то искала, то здесь — нашла. Взаимосвязь между этими альбомами — как между альбомами Queen "A Day At The Races" и "A Night At The Opera". Период непонимания — период понимания".

Билеты на концерт Земфиры стоят от 45.000 до 140.000 рублей, танцпол — 50.000.



АНОНС

Збор твораў Васіля Быкава прэзентуюць расіяне

Прэзентацыя збору твораў Васіля Быкава на рускай і беларускай мовах стане цэнтральнай падзеяй першага дня расійскай экспазіцыі на Мінскім міжнародным кніжным кірмашы.

Выпуск збору твораў класіка беларускай літаратуры — сумесны праект Саюза беларускіх пісьменнікаў і расійскага выдавецтва "Время". На сёння выйшлі шэсць тамоў 16-томнага выдання. Але беларускамоўны варыянт выходзіць тыражом усяго 3 тысячы экземпляраў.

Прэзентацыя адбудзецца 6 лютага ў 14 гадзін. У ёй возьмуць удзел удава пісьменніка Ірына Міхайлаўна Быкава, а таксама літаратары Уладзімір Някляеў, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін, Сяргей Законнікаў, Алесь Пашкевіч і Міхась Тычына.

ЗДАРЭННЕ

Каб не нашы памежнікі — птушкі б жылі

Партыя папугаяў, канфіскаваная ваеннаслужачымі Брэсцкай пагранічнай групы падчас спробы іх незаконнага перамяшчэння з тэрыторыі Украіны, утылізавана.

Як паведаміў начальнік Брэсцкага пагранічнага кантрольнага ветэрынарнага пункта Уладзімір Кавальчук, у ветэрынарны пункт перадалі 277 кантрабандных птушак, на якіх не было ніякіх суправаджальных дакументаў. "Рашэнне аб утылізацыі (прасцей кажучы, забойстве птушак) было прынята з улікам эпідэміялагічнай сітуацыі з птушыным грыпам, што склалася ў свеце. Немалаважна і тое, што папугаі з'яўляюцца патэнцыяльнымі распаўсюджвальнікамі высокапатагеннага грыпу птушак, на які хварэюць і людзі, а таксама іншых небяспечных інфекцыйных захворванняў", — патлумачыў У.Кавальчук. Папугаяў спрабаваў пераправіць невядомы на веласіпедзе непадалёк ад вёскі Ліпінкі Брэсцкага раёна, які знаходзіцца ў зоне адказнасці заставы імя Аляксандра Завідава. Кантрабандыст быў выяўлены ў непасрэднай блізкасці ад беларуска-ўкраінскай мяжы. Заўважыўшы памежнікаў, ён уцёк у напрамку Украіны, кінуўшы веласіпед і сумкі, у якіх знаходзіліся клеткі з папугаямі.

Ларыса ШЫГАНАВА.

СТАЛІЦА

Пераезд, які не радуе

2-я Гарадская клінічная бальніца Мінска пераедзе ў новыя карпусы, але не ў цэнтры горада, а амаль за яго межамі — у Навінках. Ужо некалькі гадоў вырашаўся лёс гэтага аб'екта аховы здароўя, бо і пацыенты, і медыкі выступалі супраць яе пераносу, але іх меркаванне не ўлічана.

Афіцыйнае тлумачэнне — праводзіць рэканструкцыю немэтазгодна. Калісьці пад бальніцу былі прыстасаваны карпусы былога кляштара. Тэрыторыя 2-й клінічнай трапляе ў гістарычны цэнтр Мінска, таму горадабудаўнічыя службы прапаноўвалі вынесці яе адсюль, а гэтае месца выкарыстоўваць па іншым прызначэнні. І вось рашэнне прынята.

Паслугі

Прыём макулатуры, шклатары і інш. Дапамога інвалідам, пенсіянерам г.Мінска. Тэл.261-11-87, 8-033-661-11-87, 8-044-761-11-87, 8-025-961-11-87.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

У любы дзень

Вы можаце зрабіць перадаплату за будучыя нумары "Народнай волі"

У чарговы раз паўтараем просьбу да тых, хто да гэтага часу не паспеў па-новаму зрабіць перадаплату: зрабіце гэта, калі ласка, у бліжэйшыя дні. Дзеля гэтага мы сёння зноў друкуем неабходныя карткі. Вас чакаюць у любым філіяле "Беларусбанка", а таксама ў паштовых аддзяленнях.

Ёсць магчымасць зрабіць **перадаплату** за месяц, два, тры — калі ласка! Можна аплаціць і ўсе нумары першай паловы 2008 года.

У чарговы раз нагадваем: мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: **328-63-93** ці **328-68-71**. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін.

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з Новага года павысіўся, то выгадна зрабіць перадаплату за ўсё паўгоддзе альбо за пэўны перыяд: месяц, два, тры...

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется обязательно **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 29.01.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №